

ЯК ПАКАРАЮЦЦА ВЯРШЫНІ

9

ЧЫМ ПАПОЎНІЦЬ ГАРДЭРОБ ПЕРАД ХАЛАДАМІ

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 КАСТРЫЧНІКА 2021 г. СУБОТА № 190 (29559)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«На найбліжэйшую пяцігодку дзяржаўнай праграмай «Будаўніцтва жылля» запланаваны паэтапны рост аб'ёмаў у краіне жылля, якое ўводзіцца. Калі ў мінулым годзе па дадзеным заданні мы будавалі 4 млн м$^2$, то да канца гэтай пяцігодкі лічбы складуць практычна 4,5 млн м$^2$. Паралельна з гэтым будуць павялічвацца аб'ёмы будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай і арэндных квадратных метраў. Запланаваны таксама рост будаўніцтва электражылля, па якім мы хочам выйсці на паказчык не меншы за 250 тысяч м$^2$ за год. Такім чынам, да канца пяцігодкі не менш за трэць ад усяго ўведзенага па краіне жылля будзе будавацца з выкарыстаннем электраэнергіі для ацяплення і гатавання ежы».*

## КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка прызначыў Ігара Казлова першым намеснікам начальніка ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь».
- **Выязное пасаджэнне Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў прайшло ў пункце пропуску «Брузгі» на беларуска-польскай граніцы.**
- Больш за 190 жанчын Беларусі ўзнагароджаны ордэнам Маці.
- **Міжнародная выстаўка сучаснага авангарда адкрыецца 6 кастрычніка ў Мінску.**
- У краіне прапаноўваецца адмяніць падатковую льготу для ўладальнікаў кватэр.

ISSN 1990 — 763X

***Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь***

**Паважаныя работнікі сферы адукацыі!**

**Дарагія сябры!**

**Сардэчна віншую вас з Днём настаўніка!**

*Мы па праве называем гэтае свята ўсенародным. Са школьных гадоў яно абуджае ў нас самыя цёплыя ўспаміны пра першага настаўніка і першыя школьныя дні, аб'ядноўвае ў пачуцці ўдзячнасці педагогам, якія штогод вядуць за руку мільёны беларускіх дзяцей у свет ведаў.*

*Ваша праца — вялікая місія. Час ставіць перад школай глабальныя задачы. Удасканальваюцца змест адукацыі, навучальныя тэхналогіі. Але роля асобы педагога, яго прафесійнае майстэрства, стыль жыцця і годныя ўчынкі застаюцца галоўнай умовай паспяховасці ўсяго адукацыйнага працэсу.*

*Самыя шчырыя віншаванні і словы захаплення сёння гучаць у адрас настаўнікаў, якія сэрцам выбралі гэты ганаровы і вельмі адказны шлях. Ваша любоў да дзяцей і свайго прадмета, асабісты прыклад беражлівага стаўлення да традыцый і нацыянальных каштоўнасцяў, цвёрдая грамадзянская пазіцыя выхоўваюць сапраўдных патрыётаў, якія любяць родную зямлю.*

*Дзякую вам, паважаныя педагогі, за бясконцую мудрасць, велізарнае цярпенне, чулыя адносіны да вучняў і найвялікшую адданасць сваёй справе. Жадаю моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым сем'ям!*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Навучыць бачыць прыгожа



Дваццаты вучэбны год сямейная пара Кацярына і Андрэй ЛЯЎКОВЫ — педагогі-мастакі — выкладаюць маляванне ў Рагачоўскай дзіцячай школе мастацтваў, даюць хлопчыкам і дзяўчынкам асновы ведаў па жывапісе і кампазіцыі, скульптуры і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, гісторыі мастацтваў. Дзень настаўніка — гэта іх свята. Яны скончылі мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, па размеркаванні прыехалі ў горад над Дняпром. Першае месца іх працы — дзіцячая школа. На мастацкім аддзяленні, дзе працуюць Кацярына і Андрэй, вучыцца больш за сто хлопчыкаў і дзяўчынак, а за два дзесяцігоддзі іх педагагічнай дзейнасці альма-матар падрыхтавала цэлую плеяду адукаваных выпускнікоў з цікавым бачаннем свету. Выпускнікі школы, дзе трэба вучыцца пяць гадоў, паступаюць у профільныя навучальныя ўстановы краіны і замежжа, каб стаць прафесійнымі мастакамі, дызайнерамі, архітэктарамі, мастацтвазнаўцамі, педагогамі і настаўнікамі малявання. У Рагачоўскай школе наладжана пастаянная выстаўка дзіцячых малюнкаў, установа прымае ўдзел ва ўсіх культурных мерапрыемствах горада і раёна. Таленавітыя навучэнцы педагогаў Ляўковых любяць выязджаць на пленеры, удзельнічаюць у прэстыжных конкурсах, дзе заваёўваюць прызавыя месцы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*г. Рагачоў.*

Педагагічная майстэрня

# «45 ХВІЛІН УЖО ПРАЙШЛО»?

## Настаўніца замежнай мовы — пра эйфарыю на ўроку, імправізацыю і матывацыю да навучання

**У сям'і Наталлі КАТЧАНКІ Дзень настаўніка — адно свята на траіх. Сама Наталля выкладае ў Нясвіжскай гімназіі англійскую мову. Яе муж Уладзімір працуе ў той жа навучальнай установе, але яго спецыялізацыя — нямецкая мова. Маці Наталлі — Ванда Уладзіміраўна Талай — выкладала французскую мову ў вясковай школе 32 гады, з іх пяць — ужо знаходзячыся на пенсіі.**

СТАР. 5



З першых вуснаў

# «Вы — апошняя інстанцыя перад Прэзідэнтам. На паваду ні ў кога не павінны ісці»

## Пытанні кадравай, ідэалагічнай і заканатворчай работы былі ў фокусе ўвагі на нарадзе Прэзідэнта Беларусі з кіраўніцтвам яго Адміністрацыі. Пачалася яна з хвіліны маўчання па загінулым байцы КДБ, пахаванне якога адбывалася гэтым часам

**Прэзідэнт выказаў меркаванне, што размовы палітычнага і ідэалагічнага кшталту стануць традыцыяй.**

«З часу апошняй такой сустрэчы абнавіўся і кадравы склад Адміністрацыі, змянілася кіраўніцтва. Ёсць змены ў структуры. Маё пастаяннае патрабаванне да вашай працы, кантролю выканання даручэнняў Прэзідэнта вы ведаеце. Гэта — вельмі жорсткія дысцыпліна і парадак, — кажа Прэзідэнт. — ***Ва ўмовах зацяжной пандэміі і беспрэцэдэнтных выклікаў нашай дзяржаўнасці найважнейшымі фактарамі ў арганізацыі дзейнасці Адміністрацыі таксама становяцца стратэгічнае планаванне і хуткасць рэагавання на змяненне сітуацыі ў краіне і свеце***».

На думку кіраўніка краіны, сёння як ніколі важна апярэджваць час і нельга адстаць. Гэта датычыцца ўсяго: кадравай палітыкі, графіка работы Прэзідэнта, ідэалогіі, падрыхтоўкі прыняцця палітычных рашэнняў.

«Мае падыходы вядомыя. Нарады праводзяцца, вобразна кажучы, не для «прыгожай карцінкі», а для вырашэння самых надзённых задач. Не прымяншаючы пазітыўных вынікаў і тых намаганняў, якія прыкладзены, асабліва ў вострыя перыяды, гаварыць будзем менавіта аб праблемах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### КАДРЫ

У кадравую работу, заўважае Прэзідэнт, уключана ўсё кіраўніцтва краіны, і самае галоўнае ў падыходах да гэтай работы — чысціня кадраў. «Не будзе чысціні, парадку ў галовах наверсе, не трэба ад грамадства патрабаваць гэтага парадку. У дзяржаўных структурах павінны працаваць прафесіяналы з цвёрдай дзяржаўнай пазіцыяй, патрыёты», — лічыць Прэзідэнт.

Ён заяўляе, што часам не хапае глыбіні вывучэння кандыдатаў — доўга адкрыты вакансіі.

«Хацелася б ведаць, як вядзецца работа з рэзервам кадраў? Нагадваю. У нас ёсць шэраг талковых, выдатных, высокапрафесійных хлопцаў — палкоўнікаў і нават генералаў, што ў 50—55 гадоў сыходзяць на пенсію. Гэта недапушчальна, іх неабходна выкарыстоўваць. Яны з задавальненнем гатовы працаваць у грамадзянскіх структурах. Гэта выдатныя арганізатары, патрыёты, адданыя, дысцыплінаваныя людзі», — мяркуе кіраўнік краіны.

Браць надзейныя кадры, паводле Прэзідэнта, неабходна з рэгіёнаў, бо менавіта там фарміруецца кіраўнік, які прайшоў усе прыступкі прафесійнага росту, ведае, чым жывуць людзі.

***«Менавіта там, размаўляючы з насельніцтвам, вы бачыце настрой ў грамадстве, як на іх уплывае праца кіраўнікоў на месцах. А гэта ў тым ліку адзін з элементаў фарміравання кадравага рэзерву. Але ў першую чаргу гэта работа з людзьмі***. Рашэнне праблем, з якімі яны да нас ідуць, павінна быць на асаблівым кантролі, як і выкананне даручэнняў Прэзідэнта», — канстатуе Аляксандр Лукашэнка.

У найбліжэйшы час, ён дадаў, альтэрнатыўна падключачыць кадры і праверыць выкананне даручэнняў ва ўрадзе, Адміністрацыі, КДК. «Навучыцеся патрабаваць ад сваіх падначаленых, каб і яны выконвалі вашы даручэнні», — акцэнтуе Прэзідэнт.

Ёсць, падкрэслівае ён, рэсурс у забеспячэнні гэтага кантролю — памочнікі Прэзідэнта, пашыраны іх паўнамоцтвы. Яны могуць сур'ёзна ўплываць на ўсе ўнутраныя пытанні кіравання і нацыянальнай бяспекі.

### ІДЭАЛОГІЯ

«Ідэолагі — штучны тавар. ***Бываюць добрыя юрысты, эканамісты, але ідэолагамі яны ўсе не будуць. Гэта рэдкасць. І іх трэба бачыць***. Дзякуй Богу, пасля мінулых падзей мы іх заўважылі. Галоўнае — іх зараз задзейнічаць. Чакаю ў гэтым плане якасных змен», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, ідэалагічныя недахопы вядомыя — правалена работа з грамадскімі арганізацыямі, як, напрыклад, БРСМ, «Белая Русь». Прэзідэнт адзначыў, што настаў час заканадаўча прапісаць, што такое грамадзянская супольнасць.

«Наша грамадзянская супольнасць — гэта прафсаюзы, БРСМ, ветэранскія, жаночыя арганізацыі. Яны паказалі сябе як грамадзянская супольнасць, яны масавыя і з'яўляюцца апорамі нашага грамадства», — пералічыў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт акцэнтуе неабходнасць дапамагчы з кірункамі дзейнасці арганізацыі новаму кіраўніку БРСМ.

«З ім неабходна працаваць, як працаваў Цэнтральны камітэт партыі з намі, — расказаў Прэзідэнт. — Рухацца неабходна. Трэба вызначыць кірункі іх работы, каб гэта моладзь разумела кірункі, па якіх неабходна працаваць. Некаторыя ўжо вымалёўваліся».

Кіраўнік краіны ў тэму заўважыў, што напярэдадні сустрэчы атрымаў даклад аб сітуацыі ў студэнцкай супольнасці. Па яго словах, справы ідуць добра, але ёсць некаторыя ачагі.

«Трэба з імі размаўляць. Мы ж маем вопыт дыялогавых пляцовак тэрытарыяльных. Чаму б не пайсці да студэнтаў і не арганізаваць гэтыя дыялогавыя пляцоўкі? Кожны студэнт бурліць, кіпіць, часам не ў радок, але гэта яго меркаванне. Мы павінны знайсці ў ім нешта карыснае для краіны і вычленіць гэта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заўважыў неабходнасць прааналізаваць канцэпцыю гістарычнага развіцця Беларусі: ад школьных падручнікаў, да арганізацыі тэматычных праектаў і масавых мерапрыемстваў.

### ПЫТАННІ ЗАКАНАТВОРЧАСЦІ

«Самыя важныя палітычныя рашэнні прынятыя на Усебеларускім народным сходзе. Цяпер іх трэба рэалізоўваць. Гэта размеркаванне паўнамоцтваў Прэзідэнта, рэферэндум па Канстытуцыі. Калі б мы своечасова ўзяліся за пераразмеркаванне паўнамоцтваў органаў улады, магчыма, не было б і размоў па Канстытуцыі», — кажа кіраўнік краіны.

Нагадвае ён пра неабходнасць здымаць з Прэзідэнта не ўласцівыя яму нагрузкі.

«Адміністрацыя павінна ўбіць у галовы людзей: эканоміка — гэта перадусім урад. Калі прыняты нейкія непапулярныя, папулярныя законы — гэта Андрэйчанка і Качанава (спікеры палат парламента. — «**Зв.**»). За гэта трэба несці адказнасць. Калі казаць пра кадры, ідэалогію, палітыку — гэта кіраўнік Адміністрацыі Сергеенка і яго намеснікі, — сцвярджае Аляксандр Лукашэнка. — А так усё: і добрае, і дрэннае — звалілі на Прэзідэнта. Былі перыяды, калі гэта ўсё неабходна было канцэнтраваць. Сёння мы павінны дэцэнтралізаваць, расканцэнтраваць гэта ўсё па зонах адказнасці». Па словах Прэзідэнта, новая Канстытуцыя павінна паставіць кропку ў гэтых пытаннях.

Нагадаў ён, што работа па нарматыўных прававых актах не павінна праводзіцца месяцамі. Калі рашэнне прынята, нарматыўны акт па ім, дадае Аляксандр Лукашэнка, павінен быць на працягу тыдня ў яго на стале ці ва ўрадзе.

«Валакіта нас загубіць. Як па гэтых іпэшніках. Прынята рашэнне ўпарадкаваць, не выразаць, а ўпарадкаваць. Пачалася валакіта. Пайшлі меркаванні: хочуць грошы адабраць, у бюджэце грошай няма, і нас выразаць хочуць як клас. І паехала... Гэта не так. А чаму адбылося такім чынам? Своечасова не рэалізавалі даручэнні Прэзідэнта», — абураецца кіраўнік краіны.

Тым не менш, дадае ён, дакументы, якія кладуцца на стол Прэзідэнта, павінны быць старанна прапрацаваны з улікам вывучэння альтэрнатыўных меркаванняў. Гэта датычыцца і вузка юрыдычных напрамкаў, і эканамічных пытанняў.

«Усе рашэнні па эканоміцы выпрацоўваюцца ў Савеце Міністраў. Яны павінны адпавядаць палітычнаму курсу краіны, мэтам развіцця дзяржавы, спрадвечным традыцыям і нашым нацыянальным інтарэсам. Павінны выконвацца прынцыпы справядлівага стаўлення да людзей, роўных правоў і роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, — заяўляе кіраўнік краіны. — Вы — апошняя інстанцыя перад Прэзідэнтам. На паваду ні ў кога не павінны ісці».

Пазначаныя задачы, кажа Аляксандр Лукашэнка, неабходна ўлічваць у працэсе падрыхтоўкі і асвятлення мерапрыемстваў з удзелам Прэзідэнта.

Кіраўнік краіны паўтарыў сваю думку: ініцыятыва павінна зыходзіць у першую чаргу ад Адміністрацыі, а не ад Прэзідэнта. Ён рэзюмаваў: улады прайшлі праз выпрабаванні, якія сталі каштоўным вопытам, яны паказалі праблемы, і з гэтага неабходна рабіць вынікі, дзейнічаць.

«Хто скапіціцца і бегчы не будзе, сыходзьце самі. Беларусь больш не вытрымае такіх хваляванняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта:**

«Сёння ва ўмовах абстаноўкі, якая дынамічна змяняецца, мы павінны працаваць больш актыўна, аператыўна. Калектыў Адміністрацыі настроены на такую работу. Значная ўвага была ўдзелена на нарадзе працы са сродкамі масавай інфармацыі: як не страціць аўдыторыю, што ёсць, як прывесці новую, як завабіць моладзь, што сыходзіць у інтэрнэт».

# «Мы бачым, хто чаго каштуе»

**Прэзідэнт у пачатку нарады са сваёй Адміністрацыяй пракаментаваў трагедыю, якая адбылася падчас аператыўнай праверкі аднаго з раёнаў сталіцы байцамі КДБ.**

Пачаў ён з тлумачэння папрока, які выказваюць у бок байцоў КДБ, што яны былі без бронекамізэлек і аховы. «Іх меркаванні былі такія: калі яны ў поўнай экіпіроўцы, людзі хваляюцца, дрэнна ўспрымаюць. Гэта не было спецаперацыяй, гэта былі праверкі. Іх вялі ў грамадзянскай вопратцы. Прысутнічала міліцыя ў форме, некалькі чалавек. Лішніх людзей там не было, каб не напружваць грамадства. Яны так думалі. Складана іх за гэта асуджаць», — растлумачыў кіраўнік краіны.

Ён яшчэ раз нагадаў, што гэта не была спецаперацыя, а толькі адпрацоўка раёна на прадмет прыналежнасці асобных людзей да тэрарыстычнай дзейнасці.

Падчас гэтай праверкі, па словах Прэзідэнта, з раніцы да часу трагедыі было затрымана шмат людзей, якія сёння даюць паказанні.

«Яны клеяць бірку, дзе напісалі «Працоўны рух». Гэтых «рухавікоў» мы пачалі паказваць і будзем у сетцы вам выкладваць, каб вы разумелі, што гэта за працоўны рух», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён працягнуў, што з кватэры, дзе пасля адбылася бойка, паступілі выклікі ў міліцыю з просьбай аб дапамозе. «Хлопцы паглядзелі, што і гэты адрас ёсць у спісе (спіс кватэр, якія неабходна было праверыць. — «**Зв.**»), просяць аб дапамозе. Нешта там адбылося. І яны, як добрыя беларусы, рынуліся да той кватэры. Грукаюць. Ніхто не адкрывае. Раздаецца другі званок у гэты ж аддзел міліцыі з просьбай аб дапамозе. Ускрываюцца дзверы, людзі заходзяць, каб дапамагчы...» — паведамляе Прэзідэнт.

Паводле яго, гаспадары кватэры ў той час вялі здымкі і ў рэальным рэжыме транслявалі кадры за мяжу.

«Калі хлопцы зайшлі, Дзіма папярэдзіў іншых, фактычна прыкрываючы групу, забег у кватэру адным з першых. «Зброю на пол!» Замест гэтага страляюць у Дзмітрыя. Прама ў сэрца папаў. І, паміраючы, ён з двух стрэлаў расстраляў забойцу», — расказаў Прэзідэнт.

Ён папрасіў грамадства не даваць галаслоўных ацэнак сітуацыі. «Мы зараз разбіраемся. Вельмі вялікі масіў інфармацыі», — кажа кіраўнік краіны.

Прэзідэнт мяркуе: гаспадары кватэры (загінулы супрацоўнік IT-кампаніі Андрэй Зельцэр і яго жонка) былі папярэджаны, што па раёне ідуць праверкі сілавікамі.

«Яны былі папярэджаны. Хоць дзіўна. Маглі кудысьці сысці з кватэры», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што пасля замахаў на прыхільнікаў улады прыняў рашэнне ліквідаваць звяргі НУА, НКА, апазіцыйных СМІ.

«Усплыў «Працоўны рух». Пытанне: якія адносіны мае гэты айцішнік, які мае заробкі ў дзесяць разоў вышэйшыя, чым сярэдні заробак працоўных, да іх? Ніякага. Гэта звычайныя «ігілаўскія» ячэйкі еўрапейскага разліву на тэрыторыі Беларусі. Мы сёння бачым іх на прадпрыемствах. Пакуль больш чым 10—12 не знайшлі са шматтысячных калектываў. Гэта тое ядро, якое павінна было ўзарваць працоўныя калектывы знутры», — заявіў кіраўнік краіны.

Па яго словах, асноўныя сілы гэтых ячэяк былі накіраваны на пашкоджанне чыгуначных сетак, а прамыя кантакты яны мелі са спецслужбамі ЗША.

Прэзідэнт перапыняе разважанні, што гібеллю афіцэра было дадзена яму падстава для таго, каб «пайсці фронтам, усіх давіць і травіць».

«Мы не настолькі дурныя, каб у сучасных умовах хадзіць франтамі. Калі мы пойдзем фронтам, пацярпець могуць нявінныя людзі. Могуць папасціся людзі не датычныя да гэтых спраў. Хачу чарговы раз удакладніць сваю пазіцыю. Мы кропкава, акуратна, з дапамогай спецслужбаў і іншых падраздзяленняў, будзем адпрацоўваць розных людзей, арганізацыі і варыянты», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Меркаванні

# МОЦНЫ ХОД І ХАЛОДНЫ ДУШ

## Эксперты выказаліся пра інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі тэлеканалу CNN

**Інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі CNN стала моцным паліттэхналагічным ходам з мэтай абразуміць гарачыя галовы калектыўнага Захаду і ўціхамірыць яго ваяўнічы запал. Такім меркаваннем з БелТА падзяліўся загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН.**

«Наперакор разнастайным інсінуацыям Прэзідэнт стрымаў сваё слова і даў інтэрв'ю CNN. Будзем шчырымі: ужо сам факт таго, што CNN афіцыйна ўзяла інтэрв'ю ў Аляксандра Лукашэнкі, з'яўляецца безумоўным прызнаннем калектыўным Захадам яго легітымнасці як законна выбранага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Лічу, што цяпер усе спекуляцыі па пытанні выбараў беспадстаўныя і па меншай меры неразумныя, — упэўнены аналітык. — Міжнародны аглядальнік тэлеканала CNN Мэцью Чанс стаў своеасаблівым народным парламенцёрам ад грамадзянскай супольнасці Захаду. Мяркуючы па эфіры, шчырасць, адкрытасць і прамалінейнасць кіраўніка дзяржавы вымусілі журналіста сур'ёзна пахвалявацца, паколькі ўсе заходнія медыя прывыклі да загадзя падрыхтаваных пытанняў і палітычнага цэнзуравання сваіх эфіраў».

Мікалай Шчокін лічыць, што Прэзідэнт выступіў у якасці сапраўднага нацыянальнага лідара, які ўмее трымаць удар. «Больш за тое, Аляксандр Лукашэнка задаў нямала пытанняў палітычным элітам Польшчы, Літвы і ў цэлым Захаду, які вядзе двайную гульню. Аргументавана Прэзідэнт Беларусі практычна маральна прыкаваў усю дзейнасць заходніх краін, раскрыўшы іх ілжывасць і бездаказнасць. У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы прадэманстраваў усяму свету нацэленасць на канструктыўны дыялог і абарону суверэнітэту краіны. Палітычная формула, якая цэментуе ўсю жыццядзейнасць беларускага народа і агучана Прэзідэнтам, простая — суверэнная і незалежная дзяржава ў саюзе з Расіяй (братэрскім народам) і развіццё на аснове адзінства беларускай нацыі», — сказаў эксперт.

Паводле яго слоў, у гэтым кантэксце цалкам лагічнай выглядае рэакцыя шэрагу замежных СМІ і так званай апазіцыі і здраднікаў. «Яна цалкам была прадказальнай — цяпер ворагам нумар два стаў Мэцью Чанс. Усе агучаныя тэмы — міграцыйная праблематыка, збеглыя «рэвалюцыянеры», правакацыя з самалётам Ryanair, падыходы краіны ў барацьбе з COVID-19, беларуска-расійскія адносіны — сталі халодным душам для некаторых еўрапейскіх палітыкаў. Ёсць слабая надзея, што CNN выканае сваё абяцанне і ў інтэрнэце размесціць інтэрв'ю без выключэнняў. Нарэшце, у свеце ўжо мала хто давярае палітычнай эліце калектыўнага Захаду, паколькі хлусня і комплекс непаўнацэннасці, падтасоўка фактаў і няўменне чуць і слухаць апанентаў і партнёраў, ганарлівасць і адсутнасць нацэленасці на дыялог сталі брэндам заходнееўрапейскага свету, — падкрэсліў Мікалай Шчокін. — Развязаная спецслужбамі Захаду падрыўная вайна і яе ідэалогія, якая транслюецца збеглымі, супраць Беларусі з'ядналі беларускі народ і вымусілі ўсвядоміць усе выгады «дэмакратычных свабод», якія нам былі падрыхтаваны».

Мікалай Шчокін прызнае, што Беларусь праходзіць няпросты этап свайго развіцця: наша краіна шмат у чым дзякуючы палітычнай волі Прэзідэнта выстаяла і змагла абараніць сваё непарушнае права жыць свабодна. «Правальная санкцыйная палітыка Захаду і няўрымслівае жаданне яго эліт ператварыць нашу краіну ў калонію, тэрыторыю адчужэння ператварылі сам калектыўны Захад у палітычнага ізгоя і эканамічную «кульгавую качку». Апошнія падзеі, звязаныя з забойствам афіцэра КДБ, сталі доказам, што беларускі народ вядзе вайну на выжыванне з нягоднікамі і палітычнымі злачынцамі, якія ўзначальваюць Польшчу, Літву і шэраг іншых краін. Таму інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі CNN стала моцным паліттэхналагічным ходам з мэтай абразуміць гарачыя галовы калектыўнага Захаду і ўціхамірыць яго ваяўнічы запал», — рэзюмаваў Мікалай Шчокін.

Прэзідэнт дакладна прадставіў сваю пазіцыю, яго аргументы зразумелыя. Такое меркаванне ў эфіры «Альфа Радыё» выказаў **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей АЎДОНІН**. Эксперт адзначыў эмацыянальны стан журналіста пасля інтэрв'ю. Ён лічыць, што пастаўленыя кіраўніцтвам тэлеканала мэты дасягнуты не былі. «У прынцыпе, пытанні Аляксандру Рыгоравічу ён задаваў тыповыя, падобныя на тыя, што былі падчас «Вялікай размовы з Прэзідэнтам». Але ўсе мы бачылі, да чаго падводзілі супрацоўнікі CNN. Назіралася спроба перавярнуць рэальнасць і выказаць, што менавіта Беларусь вінаватая ў тых ці іншых праблемах, якія зараз ёсць у тым жа Еўрасаюзе. Але кіраўнік дзяржавы выразна прадстаўляў сваю пазіцыю, яго аргументы былі зразумелыя», — лічыць Аляксей Аўдонін.

Як паведамлялася, Прэзідэнт пагадзіўся на дадзенае інтэрв'ю толькі пры ўмове, што яго пакажуць цалкам, нічога не хаваючы. «Паглядзім, ці выканаюць яны сваё абяцанне. Але ўжо цяпер у амерыканскай прэсе з'явіліся абвінавачванні журналіста CNN у тым, што ён не меў права называць кіраўніка дзяржавы Прэзідэнтам — маўляў, гэта нелегітымна. Мы бачым, што ў лагеры калектыўнага Захаду ёсць разлад, ёсць элементы непаразумення. Зараз унутры краін Захаду, Еўропы, англасаксонскага аб'яднання ёсць сілы, якія ў рэальнасці зацікаўлены ў тым, каб слухаць і чуць, а ёсць настроеныя на вайну», — адзначыў аналітык.

Ён падкрэсліў, што цяпер такія СМІ, як CNN, BBC, Sky News, фарміруюць грамадскую думку. Сваёй падачай яны здольныя змяняць грамадскае ўспрыманне той ці іншай сітуацыі. «Калі цяпер CNN выканае сваё абяцанне і ў поўным аб'ёме прадставіць інтэрв'ю, то мадэль свету, якая назіралася апошні год, будзе зменена. Магчымыя і спробы ціску на кіраўніцтва і журналістаў CNN, каб не дапусціць распаўсюджвання інтэрв'ю. Але мы будзем папулярызаваць матэрыял, забяспечым і замежнае суправаджэнне, каб англамоўная аўдыторыя таксама змагла ўбачыць адказы», — падкрэсліў Аляксей Аўдонін.

Гора

# «ВЯЛІКІМ СЭРЦАМ ЗАКРЫЎ СВАІХ ТАВАРЫШАЎ»

**У Мінску ў клубе імя Ф. Дзяржынскага прайшло развітанне з загінулым супрацоўнікам КДБ Дзмітрыем Федасюком.**

«Мы ведаем, хто з'яўляецца натхняльнікам забойства афіцэра КДБ, і лічым, што яны перайшлі чырвоную рысу», — пра гэта заявіў **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ** падчас развітання з загінулым супрацоўнікам КДБ Дзмітрыем Федасюком, перадаў тэлеканал «Беларусь 1». «Гэта адзін з самых лепшых байцоў. Гэта клапатлівы сын, любячы муж і бацька для сваёй жонкі і маленькай дачкі, верны таварыш, дужы, з вялікім сэрцам. Вось гэтым сваім вялікім сэрцам ён і закрыў сваіх таварышаў. Мы ведаем, што ён першым фактычна зайшоў у гэтую кватэру. У яго крыху было часу на рэагаванне. Але ён абраў тое, што закрыў сваёй спінай, сваім сэрцам сваіх сяброў. Мы, вядома, вельмі смуткуем», — сказаў Іван Тэртэль.

Старшыня КДБ таксама падкрэсліў, што смерць Дзмітрыя Федасюка — вялікая страта для ведамства. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы сям'і будзе аказана ўся магчымая дапамога.



Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА выказвае спачуванні сям'і загінулага.



Фота БелТА.

«Перажыць гэта немагчыма. Хаваць дзіця — гэта самае страшнае, што можа быць, — сказала **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА**. — Гэты малады чалавек толькі ўступіў у жыццё, але ён быў сапраўдным героем нашай краіны. Ён патрыёт нашай краіны. Ён рабіў усё для таго, каб абараніць свет і спакой у нашых сем'ях, у нашай краіне. І таму, вядома, мы смуткуем разам з роднымі і блізкімі. Мы смуткуем усёй краінай, таму што мы не маем права губляць такіх маладых людзей, якія абараняюць нашу краіну».

«Хачу ў гэты цяжкі дзень сказаць, што тыя, хто спрабуе развязаць вайну рознымі спосабамі — тэрарыстычнымі, экстрэмісцкімі, кожнаму будзе дадзена ацэнка, — адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**. — Кожны атрымае па заслугах. Я не палохаю. Я проста кажу аб тым, што так павінна быць. Подласць, злачыннасць павінны быць пакараныя. А сёння мы смуткуем разам з сям'ёй, разам з усімі людзьмі».

**Старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Алег БЕЛАКОНЕЎ** лічыць, што мы занадта мякка паступаем з экстрэмістамі і ім падобнымі. «Чамусьці яны дзейнічаюць па-за рамкамі закона, а мы стараемся ўсё зрабіць па законе. Па законе з імі гутарыць, па законе іх пераконваць, па законе іх угаворваць», — дадаў парламентарый.

Як паведамлялася, 28 верасня, падчас правядзення спецыяльных мерапрыемстваў па адрасоўцы адрасоў, па якіх маглі знаходзіцца асобы, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці, у адной з кватэр жылога дома па супрацоўніках праваахоўных органаў асабліва небяспечным злачынцам са стрэльбы быў адкрыты агонь на паражэнне. У выніку супрацоўнік Камітэта дзяржбяспекі быў смяротна паранены.

Развітацца з загінулым афіцэрам прыйшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў і сілавых структур, калегі, сябры, простыя беларусы, якія не засталіся ўбаку ад трагедыі.

**Матэрыялы падрыхтаваў Пётр ДУНЬКО.**

Сітуацыя

# Бізнес на бежанцах

## На тэрыторыі Польшчы дзейнічае сетка арганізатараў незаконнай міграцыі

Пра гэта паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. «Польшча не хавае, што менавіта з яе тэрыторыі аказваецца садзейнічанне нелегальнай міграцыі. Паводле афіцыйнай статыстыкі, якая амаль штодня публікуецца Пагранічнай вартай у «Твітэры», толькі за апошні месяц на польскай тэрыторыі затрымана амаль 100 памагатых, якія аказвалі садзейнічанне ў перасячэнні польскай граніцы, а таксама забяспечвалі перамяшчэнне бежанцаў у краіны ЕС. Акрамя таго, незаконнае выцясненне замежнікаў у Беларусь забяспечваюць і прадстаўнікі Пагранічнай варты. Карыстаючыся службовым становішчам і ўвядзеннем надзвычайнага становішча ў прыгранічных раёнах, польскія сілавікі падымаюць платы, гвалтоўна выцясняюць і проста выкідваюць людзей без прытомнасці на беларускую тэрыторыю», — распавялі ў ДПК.

У мэтах утойвання сваіх незаконных дзеянняў ад грамадскасці Польшча не дапускае на лінію мяжы ні журналістаў, ні праваабаронцаў, ні нават прадстаўнікоў еўрапейскага пагранічнага агенцтва Frontex. «Такім чынам, статыстыка Пагранічнай варты Польшчы пра шматлікія затрыманні памагатых на тэрыторыі краіны, а таксама фота- і відэаматэрыялы Дзяржпагранкамітэта Беларусі адносна незаконных дзеянняў польскіх памежнікаў у частцы дапамагання незаконнага перасячэння беларускай граніцы сведчаць пра існаванне сеткі арганізатараў незаконнай міграцыі на польскай тэрыторыі», — падкрэслілі ў Дзяржпагранкамітэце.

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «Трэба аб'яднаць намаганні, каб сумесна вырашаць глабальныя задачы, што стаяць перад Беларуссю і Расіяй»

**Старшыня Савета Рэспублікі сустрэлася з дэлегацыяй Саюза жанчын Расіі.**



— Я рада вітаць вас у Савеце Рэспублікі і рада знаёмству, — звярнулася яна да ўдзельніц сустрэчы і расказала, што з Саюзам жанчын Расіі пазнаёмілася падчас Еўразійскага жаночага форуму ў Санкт-Пецярбургу, які праходзіў пад старшынствам Валянціны Мацвіенкі. — Зараз мы зноў рыхтуемся да гэтай важнай падзеі. Я рада таму, што такія добрыя адносіны складаюцца паміж нашымі арганізацыямі.

Спікер верхняй палаты беларускага парламента звярнула ўвагу на значнасць супрацоўніцтва жаночых арганізацый дзвюх краін:

— Жанчыны могуць многае. Я заўсёды кажу: мы можам усё. Нам трэба толькі аб'яднаць свае намаганні для таго, каб сумесна вырашаць тыя глабальныя задачы, якія стаяць сёння перад нашымі краінамі, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Яна з жалем канстатавала, што сённяшні дзень для Беларусі пачаўся з сумнай падзеі — развітаннем з супрацоўнікам КДБ, маладым афіцэрам, патрыётам сваёй краіны, які загінуў пры выкананні службовага абавязку:

— Так склалася, што ён загінуў, абараняючы сваю краіну. У 2020 годзе мы сутыкнуліся з сур'ёзнай бядой: шмат у чым для нас гэта было нечакана, — расказала Наталля Качанава і прыгадала той адносна нядаўні перыяд. — Я часам прачыналася і думала: няўжо я ў Беларусі? І сёння гэтыя сілы, якія ўздзейнічаюць на нашу краіну, робяць усё, каб дэстабілізаваць сітуацыю ўнутры Беларусі, каб зламаць, разарваць нашу краіну. У гэтым няма ніякага сумневу. І гэты малады хлопец загінуў, выконваючы свой абавязак па абароне Радзімы і нашага народа. Адбылася трагедыя.

Спікер верхняй палаты парламента падкрэсліла: краіна выстаяла ў той складаны перыяд, зробіць гэта і цяпер. Таксама яна падзякавала расійскаму боку за падтрымку:

— Вы заўсёды былі побач з намі. Гэтая падтрымка была патрэбна тады, як патрэбна і цяпер, калі ідзе падпісанне дарожных карт, калі ідзе сумесны рух у рамках інтэграцыйных працэсаў паміж нашымі краінамі, — акцэнтавала яна на важнасці гэтых працэсаў.

У сваю чаргу **дэпутат Дзяржаўнай думы Расіі, сакратар Прэзідыума Цэнтральнага савета партыі «Справядлівая Расія — патрыёты — за праўду» па пытаннях культурнай палітыкі Алена ДРАПЕКА** падзякавала Саюзам жанчын дзвюх краін за арганізаваную сустрэчу.

— У нас была магчымасць пагутарыць не толькі з бізнесам, дзелавымі коламі, журналістамі, але і паміж сабой. Мы дамовіліся аб супрацоўніцтве па некалькіх тэмах, — паведаміла яна і расказала, што ў Дзяржаўнай думе курыруе дзве працоўныя групы: адна разглядае пытанне аб незаконным вывазе культурных каштоўнасцяў, сфера дзейнасці другой — пошукавыя атрады.

— Разам з Беларуссю мы знаходзімся ўнутры ЕАЭС, дзе сёння не ўрэгуляваныя пытанні ўнутранага перамяшчэння культурных каштоўнасцяў і адзіных рэестраў выкрадзеных культурных каштоўнасцяў, забароненых да вывазу, — адзначыла парламентарый.

Паводле яе слоў, гэтыя рэестры патрэбныя для мытных і памежных органаў абедзвюх краін пры перамяшчэнні каштоўнасцяў у трэція краіны.

Што датычыцца другога напрамку для ўзаемадзеяння — дзейнасці пошукавых атрадаў, — у Расійскай Федэрацыі сутыкнуліся з праблемай, калі археалагічныя помнікі і зямля знаходзяцца ў асобным абароце, а астанкі вайскоўцаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай, Першай сусветнай войнаў, не знаходзяцца ў гэтым спісе.

— Прыватныя ўласнікі часам перашкаджаюць правядзенню пошукавых работ на сваёй тэрыторыі, — патлумачыла яна і прапанавала вырашыць гэтыя пытанні на заканадаўчым узроўні. — Мы будзем працаваць сумесна і, магчыма, выйдзем на парадненне паміж Расіяй і Беларуссю, а магчыма, і ўнутры ЕАЭС па гэтых пытаннях.

Трэба сказаць, што ў складзе расійскай дэлегацыі была **рэктар Санкт-Пецярбургскага сацыяльна-эканамічнага інстытута, старшыня Санкт-Пецярбургскага рэгіянальнага аддзялення Агульнарасійскай грамадска-дзяржаўнай арганізацыі «Саюз жанчын Расіі» — «Жаночы альянс» Алена КАЛІНІНА**. Яна расказала, што задача арганізацыі — развіццё сяброўскіх і міжнародных адносін паміж кампаніямі і людзьмі.

— Летась мы падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве з Саюзам жанчын Беларусі. Мы вызначылі цэлы шэраг мерапрыемстваў для таго, каб насыціць дагавор рэальным зместам і каб наша дзейнасць была карыснай, — падкрэсліла яна. — Каб вызначыць шляхі і тактыку развіцця, неабходныя асабістыя сустрэчы. Якой бы ні была дасканалай сучасная камунікацыйная тэхніка, асабістая сустрэча — гэта вельмі важна. Мы вядзём канструктыўную размову, гаворым аб будучыні, гаворым аб тым, якія фактары ствараць альбо ліквідаваць для таго, каб супрацоўніцтва жанчын Расіі і Беларусі было эфектыўным.

Яна расказала аб праекце «Жанчыны Расіі і Беларусі: місія стварэння»:

— Мне здаецца, што ў праціву ўсім пратэсным дзеянням, скажэнню гісторыі і спробам разбурыць добрае стаўленне і павагу адно да аднаго мы хочам прадставіць наша жаданне супрацоўнічаць. І мы абмяркоўваем канкрэтныя меры: выставы, канферэнцыі, умовы для супрацоўніцтва кампаній, і таму ў складзе нашай дэлегацыі кіраўнікі бізнесу і бізнес-асацыяцый, — патлумачыла Алена Калініна.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Да Дня настаўніка

# МУЖЧЫНЫ Ў ШКОЛЕ — РЭДКАСЦЬ

**Амаль 94 працэнты ўсіх настаўнікаў, што працуюць у беларускіх школах, маюць вышэйшую адукацыю. Як вынікае са статыстычнага агляду, падрыхтаванага да Дня настаўніка, гэта прафесія носіць у Беларусі ярка выяўлены жаночы характар. Так, сярод настаўнікаў і кіраўнікоў школ жанчын — 86,5 працэнта.**

Стаж работы па спецыяльнасці больш як 15 гадоў маюць 68,6 працэнта педагогаў. Вышэйшую і першую кваліфікацыйную катэгорыі — 78,7 працэнта.

Агульная колькасць настаўнікаў (уключаючы сумяшчальнікаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі) у 2020/2021 навучальным годзе склала 111,4 тысячы чалавек: у гарадах і пасёлках працуюць 77,9 тысячы педагогаў, у сельскай мясцовасці — 33,5 тысячы.

Па сваім колькасным складзе сярод іх лідзіруюць настаўнікі замежнай мовы (13 197 чалавек). За імі ідуць настаўнікі матэматыкі (7289), беларускай мовы і літаратуры (6732), рускай мовы і літаратуры (6635). Даволі шмат і фізрукоў (6549). А вось самыя рэдкія ў школе настаўнікі выяўленчага мастацтва і чарчэння і дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі — іх усяго 840 і 410 чалавек адпаведна.



Фота БелТА.

**Настаўнік Мінскай гімназіі № 7 Максім Ільіч ГОЛАД на ўроку.**

У агульнай колькасці педагогаў, якія выкладаюць у школе асобныя прадметы, прадстаўнікі моцнага полу на пачатак 2020/2021 вучэбнага года складалі 18,3 працэнта. У ТОП-5 прадметаў, дзе колькасць настаўнікаў-мужчын была самая высокая, увайшлі «фізічная культура» (62,7 працэнта ад агульнай колькасці), «дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» (58,3 працэнта), «працоўнае навучанне» (42,4 працэнты), «фізіка» (34,3 працэнта) і «гісторыя і грамадазнаўства» (29,3 працэнта).

А вось сярод настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры і рускай мовы і літаратуры мужчын-педагогаў амаль няма (усяго 2,6 і 2,1 працэнта адпаведна). Сярод настаўнікаў замежнай мовы іх толькі 5 працэнтаў, біялогіі — 8,9 працэнта, хіміі — 8,5 працэнта.

Усяго на пачатак 2020/2021 вучэбнага года ў краіне працавалі 3009 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 205 гімназій і 25 ліцэяў. Колькасць навучэнцаў перавышала 1 мільён 58 тысяч чалавек. У гарадскіх школах на аднаго настаўніка прыпадае 11 вучняў, а ў сельскіх — толькі пяць.

Сярэдняя заработная плата настаўніка ў студзені — жніўні 2021 года склала 1139,5 рубля.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Інфляцыя ў еўразоне ў верасні паказала рэкордны рост за 13 гадоў



Інфляцыя ў еўразоне ў верасні, паводле апублікаваных папярэдніх звестак Еўрастата, склала 3,4 % у гадавым выражэнні, павялічыўшыся на 0,4 % у параўнанні з паказчыкам за жнівень. Як сцвярджае агенцтва Bloomberg, гэта самы высокі ўзровень інфляцыі ў аб'яднанні з 2008 года, паведаміла ТАСС. Самы вялікі рост цэн — на энерганосьбіты (на 17,4 %, у жніўні — на 15,4 %), за імі ідуць прамысловыя тавары (на 2,1 %, у жніўні — на 2,6 %), далей прадукты, алкаголь і тытунь (на 2,1 % / 2 %), а таксама паслугі (на 1,7 % / 1,1 %). Найбольш высокі паказчык інфляцыі ў мінулым месяцы быў зафіксаваны ў Эстоніі (6,4 %), Літве (6,3 %) і Славакіі (5,1 %), самы нізкі — на Мальце (0,7 %), у Партугаліі (1,3 %), Грэцыі і Фінляндыі (па 2,1 %).

### У Сальвадоры ўпершыню ажыццявілі крыптамайнінг з выкарыстаннем энергіі вулканаў



Як паведаміў у сваім «Твітэры» прэзідэнт краіны Наіб Букель, Сальвадор здабыў 0,00599179 біткоіна — прыкладна $ 269 — на майнінгавых установах, якія атрымліваюць электраэнергію ад вулкана. Букель адзначыў, што гэты праект усё яшчэ на стадыі распрацоўкі, а здабыча крыптавалюты была ажыццёўлена ў рамках тэсціравання сістэмы. Як вядома, Сальвадор у пачатку верасня абвясціў біткоін афіцыйным плацежным сродкам. Яшчэ раней, у ліпені, прэзідэнт краіны распарадзіўся распрацаваць план па арганізацыі здабычы «крыпты» з выкарыстаннем таннай, на 100 % аднаўляльнай і чыстай энергіі вулканаў энергетычнай кампаніяй краіны LaGeo SA de CV. У Сальвадоры знаходзіцца 20 патэнцыйна актыўных вулканаў, сведчаць даныя VolcanoDiscovery.com. Дзяржаву называюць «краінай вулканаў», і па афіцыйных даных ужо цяпер на геатэрмальную энергію прыпадае амаль чвэрць — каля 22 % — унутранай вытворчасці электрычнасці.

### У Брытаніі адкрылі два новыя віды дыназаўраў



На брытанскім востраве Уайт выяўлены шкілеты двух новых відаў вялікіх драпежных дыназаўраў. Даследчыкі называюць адкрыццё вялікім сюрпрызам. Новыя віды, Ceratosuchops inferodios і Riparvenator milnerae, жылі каля 125 мільёнаў гадоў таму. Рэшткі дыназаўраў знаходзілі на востраве на працягу некалькіх гадоў. Першымі адшукалі вялікія фрагменты двух чэрапаў, а пасля каманда мясцовага палеанталагічнага музея падключылася да аматарскіх раскопак і знайшла буйную частку хваста. Цяпер палеантолагі прыйшлі да высновы, што сабраныя фрагменты (іх набралася каля 50) належаць двум новым відам. Фрагменты костак будуць выстаўлены ў мясцовым палеанталагічным музеі ў Сэндаўне. Яго куратар, доктар Марцін Хант, лічыць, што знаходка канчаткова замацавала статус вострава Уайт як «меккі для палеантолагаў», якія жадаюць знайсці дыназаўраў.

# «45 ХВІЛІН УЖО ПРАЙШЛО»?

## ЗДЗІВІЦЬ АНГЛІЧАНІНА...

— Сама я з Нясвіжскага раёна, з вёскі Высокая Ліпа. Мая матуля была і маёй школьнай настаўніцай, таму, шчыра кажучы, я з дзяцінства ведала, што пайду па яе слядах. Яшчэ вучаніцай дапамагала ёй правяраць сшыткі, а французская мова была маім любімым прадметам. У сваім выбары ніколькі не сумнявалася — хачу вучыцца ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце замежных моў — там, дзе вучылася і мая маці. Паступіла, скончыла і вось ужо 24 гады працую ў адной установе — Нясвіжскай гімназіі, — расказвае Наталля Катчанка. — Мая маці была не проста маім настаўнікам, але і прыкладам, як трэба сябе паводзіць на ўроку, як ставіцца да вучняў. Мяне заўсёды захапляў яе энтузіязм і энергічнасць. Яна ўсе заняткі вяла стоячы, і я таксама не ўяўляю, як можна сядзець на ўроку за настаўніцкім сталом. Я ўвесь час у руху, затое бачу ўсіх дзяцей.

***— Наталля Уладзіміраўна, многім выпускнікам савецкай школы замежная мова так і не скарылася. Ці можна навучыць ёй кожнага альбо для гэтага павінны быць пэўныя здольнасці?***

— Вельмі шмат залежыць ад матывацыі і ўнутранай патрэбы. А дзеці гэтай патрэбы яшчэ не адчуваюць, таму неабходна прыкласці пэўныя намаганні, каб улюбіць у свой прадмет і натхніць. Здольнасці могуць паскорыць працэс вывучэння, але галоўны каталізатар — усё ж такі матывацыя. Так, у савецкія часы школьнікі вучыліся пераважна чытаць і перакладаць, а не размаўляць, сучасных методык яшчэ не было. І ўвогуле, было незразумела, навошта нам замежная мова і дзе яна можа спатрэбіцца. А сёння ўрокі замежнай мовы маюць практычную камунікатыўную арыентаванасць. Я, напрыклад, у сваёй педагагічнай практыцы прымяняю прынцыпы актыўнай ацэнкі. Мы разам з вучнямі ставім на пачатку ўрока мэту, якой хочам дасягнуць. Гэта прынцыпова важны момант. Мэта павінна быць зразумелай, яшчэ лепш — каб яна была сфармуляваная на мове вучняў.

**«Ніводны ўрок нельга спрагназаваць да канца. Непасрэдна на ўроку можа адбыцца азарэнне, ён пойдзе зусім па іншым кірунку і атрымаецца нават лепшы, чым планавалася».**

Камунікатыўную накіраванасць маюць і сучасныя падручнікі. Да таго ж сёння ёсць шмат дадатковых магчымасцяў для авалодання замежнымі мовамі: можна глядзець відэаролікі, кінастужкі без перакладу, слухаць замежных выканаўцаў, чытаць замежную літаратуру на мове арыгінала.

Можа, гэта прагучыць не вельмі сціпла, але калі вучні нашай гімназіі трапляюць у іншыя ўстановы адукацыі (у Мінскі абласны ліцэй, Ліцэй БДУ), мы чуем пра іх толькі станоўчыя водгукі. Нясвіжская гімназія — гэта як знак якасці. Нашы дзеці свабодна размаўляюць на замежнай мове, не баяцца гэта рабіць. Некалькі гадоў таму ў гімназію прыязджаў вядомы брытанскі педагог Рос Морысан Макгіл, пісьменнік, блогер і стваральнік сайта teachertoolkit.co.uk (інструменты для настаўніка), у якога цяпер больш за 10 мільёнаў чытачоў. Рос нават намінаваўся газетай The Sunday Times у лік 500 самых уплывовых людзей у Вялікабрытаніі. Дык вось, нашым гімназістам удалося яго здзівіць *(усміхаецца)*. Рос сказаў, што быў у многіх краінах, але беларускія дзеці скарылі яго сваёй шчырасцю і адкрытасцю, адзначыў, што яны першыя робяць крок насустрач незнаёмаму чалавеку з чужой краіны.

## ШЧЫРАСЦЬ ВІТАЕЦЦА...

***— А вы ліберальны ці патрабавальны настаўнік? Чаго ніколі не дапусціце на сваім уроку ці па-за ўрокамі ў стасунках з вучнямі?***

— Не дапушчу хлусні. Адносіны з дзецьмі павінны будавацца на даверы. Калі, напрыклад, вучань не падрыхтаваўся да ўрока, я заўсёды пытаюся, у чым прычына. І дзеці ведаюць, што мне лепш сказаць праўду. Разумею, што вучні — вельмі загружаныя па вучобе, ёсць яшчэ шматлікія пазакласныя і пазашкольныя мерапрыемствы, і ў іх часам проста не хапае сіл на выкананне дамашняга задання. Яны падаюць на ложак і засынаюць. Я цаню адкрытасць і не зацікаўлена ў дрэнных адзнаках, бо гэта самы горшы матыватар для вучобы. У сваю чаргу, сама імкнуся быць заўсёды шчырай з вучнямі. Калі не ведаю адказу на іх пытанне, прызнаю гэта і абяцаю абавязкова знайсці яго да наступнага ўрока.

***— Ці падзяляеце вы думку, што без канкурэнцыі немагчыма рушыць наперад? Урокі могуць быць без адзнак у балах?***

— Мая мара — перайсці на безадзнакавую сістэму, бо адзнакі, на маю думку, перашкаджаюць вучням быць на ўроку свабоднымі. У малодшых класах дзеці на іх асабліва моцна зацыкліваюцца, баяцца, што атрымаюць не тую адзнаку, якую «заказалі» бацькі. У малых спрацоўвае ўнутраны тормаз, які не дае магчымасці на ўроку раскрыцца. Вучні думаюць толькі аб тым, каб не зрабіць памылку і не знізіць свой бал. Увогуле, у адукацыі павінна быць не спаборніцкае асяроддзе, а прастора для сумеснай творчасці, сумеснай калектыўнай дзейнасці. Навык каманднай працы архіважны для XXI стагоддзя. Менавіта таму я і не люблю розныя конкурсы.

***— А якім павінен быць урок, каб ён прынёс задавальненне і настаўніку, і вучню?***

— Калі вучні чуюць званок на перапынак і пытаюцца: «А што, 45 хвілін ужо прайшло?», для мяне гэта найлепшы паказчык, што ўрок атрымаўся, працэс ідзе, і дзеці працуюць ад пачатку ўрока і да канца. Гэта проста настаўніцкі кайф, якім хочацца падзяліцца з калегамі. Але ніводны ўрок нельга спрагназаваць да канца. Непасрэдна на ўроку можа адбыцца азарэнне, ён пойдзе зусім па іншым кірунку і атрымаецца нават лепшы, чым планавалася. Імправізацыя дадае іскрынку любому ўроку.

## МЕДЫЙНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ

***— Ведаю, што вы працуеце і над дапаможнікамі для настаўнікаў. Гэта ж велізарная праца. Што натхніла ўзяцца за яе? Ніхто не пытаўся, навошта гэта вам?***

— Такія пытанні гучаць пастаянна. У маі выйшлі «Планы-канспекты для падручніка 10 класа па англійскай мове». Гэта сумесная праца з маёй калегай з Мазыра Веранікай Арловай. Вялікая ўдача — сустрэць аднадумца.



Мы абедзве — настаўнікі-метадысты. Нас аб'яднала актыўная ацэнка і медыяадукацыя. Мы шмат выступаем перад настаўнікамі на розных семінарах і курсах, у нас ёсць шмат напрацовак. І мы вырашылі, што трэба падзяліцца гэтым з усімі. Як пажартаваў Рос Макгіл, «для настаўнікаў, якія не дзеляцца з калегамі сваімі ведамі, у пекле будзе адмысловае месца» *(смяецца)*. Галоўная ідэя планаў — рэалізацыя прынцыпаў стратэгіі Актыўнай ацэнкі праз медыяадукацыйныя патэнцыял. Дзякуючы разнастайным практыкаванням і рабоце з дыяграмамі, схемамі, анімацыяй, малюнкамі і фота вучні вучацца аналізаваць і крытычна ацэньваць прапанаваны медыякантэнт, а таксама ствараць уласны прадукт. Для кожнага ўрока мэта сфармулявана як прагназаваны вынік, і вучні разумеюць, што канкрэтна яны вывучаць у межах урока. Да кожнага урока, а таксама да некаторых заданняў (у тым ліку і дамашніх) прапісаны крытэрыі ацэньвання. Гэта дапамагае зрабіць сітуацыю выстаўлення адзнак максімальна празрыстай. Таксама амаль да кожнага ўрока сфармулявана ключавое пытанне, якое, безумоўна, выкліча зацікаўленасць у вучняў і павысіць матывацыю да вывучэння новай тэмы. Зараз мы ўжо працуем над дапаможнікам з планамі-канспектамі ўрокаў для 11-х класаў.

***— Вы згадалі медыяадукацыю. А як медыяадукацыйны рэсурс можна задзейнічаць на ўроках замежнай мовы?***

— У параўнанні з іншымі прадметнікамі, у настаўнікаў замежнай мовы больш магчымасцяў для медыяадукацыйнай дзейнасці на ўроку. Напрыклад, для ўвядзення вучняў у іншамоўную камунікатыўную сітуацыю, адпрацоўкі актыўнай лексікі, развіцця навыкаў вуснай мовы можна выкарыстоўваць любы фрагмент тэлеперадачы, ролік з інтэрнэту, вытрымку з артыкула, цэлы артыкул або цытату вядомага чалавека. Можна дыскутаваць, абменьвацца думкамі па розных праблемах у класе, у сацыяльных сетках або пісаць на электронную скрыню. У кожным класе, нават пачынаючы з трэцяга і чацвёртага і заканчваючы адзінаццатым, можна з поспехам выкарыстоўваць формы навучання, якія будуць накіраваны на павышэнне медыйнай адукаванасці вучняў, жаданне чытаць, даведвацца новае, крытычна ставіцца да інфармацыі, быць аўтарамі медыяпаведамленняў.

У сярэднім школьным узросце вельмі важна развіваць такія медыйныя ўменні, як асэнсаваны пошук інфармацыйнай крыніцы з улікам запытаў, разуменне наступстваў да карыстання неправеранай інфармацыяй, уменне ажыццяўляць пошук у традыцыйных і электронных крыніцах, такіх як вэб-сайты, блогі, парталы і друкаваныя матэрыялы, уменне дакладна фармуляваць запыт. Любую атрыманую інфармацыю трэба крытычна ацэньваць. І настаўнік павінен гэтаму навучыць.

## АДПАЧЫЦЬ... У ГУЛЬНІ

***— А як доўга можна працаваць у рэжыме шматзадачнасці? Як вам удаецца абараніцца ад прафесійнага самавыгарання? Тым больш што ў сям'і — двое педагогаў і двое дзяцей-школьнікаў? Ці ёсць у вас нейкія сямейныя рэцэпты? Як вы аднаўляецеся? Што можа вас натхніць?***

— У нас трое дзяцей. Старэйшы сын Паша ўжо скончыў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт і працуе ў нашай раённай бальніцы хірургам. І так сталася, што ва ўсіх трох я ў розных класах выкладала англійскую мову. Вядома, калі твае бацька і маці працуюць у гімназіі, дзе ты вучышся, — гэта няпроста, бо накладвае дадатковую адказнасць. Ну як можна прыйсці ў школу непадрыхтаваным? Мой сярэдні сын Ваня аднойчы сказаў: «Лепш бы я вучыўся ў іншай школе». Ён, дарэчы, любіць правяраць мяне, ці ведаю я нейкія сучасныя выразы. Асабліва я падвергалася «выпрабаванням» з яго боку пасля англійскага летніка, дзе ён удзельнічаў. Мая малодшая дачка, дзесяцігадовая Маша, якая вельмі любіць маляваць, кажа: «Матуля, не крыўдуй, але маляванне я люблю больш, чым англійскую мову». А я не крыўдую, бо бачу, што ў дачкі ёсць талент, хоць наша педагагічная дынастыя можа і не атрымаць працяг. Лічу, што кожны павінен знайсці сабе занятак па душы, бацькі ні ў якім разе не павінны ціснуць. І дзіцяці ні ў якім разе нельга казаць, што яго мэта — няправільная...

У нашай сям'і ёсць агульнае для ўсіх захапленне — інтэлектуальныя гульні. Муж з'яўляецца кіраўніком інтэлектуальных каманд у нашай гімназіі. І дзеці, і педагогі пад яго кіраўніцтвам дабіваліся вельмі добрых вынікаў на самых розных узроўнях. Каманда «Да сустрэчы на Марсе» — двойчы чэмпіёны Беларусі па камандный «Сваёй гульні» ў 2019 і 2020 гадах, а «Рачкі» — віцэ-чэмпіёны краіны па «Брэйн-рынгу» ў 2019 годзе.

Інтэлектуальныя гульні — гэта аддушына. Нават пасля цяжкага дня дзеці з задавальненнем ходзяць на трэніроўкі, гуляюць, камунікуюць паміж сабой. Такія гульні развіваюць ва ўсіх нестандартны падыход да рашэння розных задач і сітуацый, у тым ліку вучэбных. І мы, педагогі гімназіі, удзельнічаем у гульнях як дарослая каманда. Для нас гэта перазагрузка і спосаб абстрагавацца ад працы.

Зараз наш сын Ваня вучыцца ў Ліцэі БДУ і працягвае ўдзельнічаць у інтэлектуальным руху ліцэя. Ён нават згуляў у камандзе Белдзяржуніверсітэта, прысвечанай яго стагоддзю, якую пакажуць у серыі асенніх гульняў на АНТ. У каманду ўвайшлі выкладчыкі, некалькі студэнтаў і наш сын. Для нас, бацькоў, гэта падстава для гонару. І Маша наша таксама з задавальненнем ходзіць на інтэлектуальныя трэніроўкі. Дома мы любім разам з дзецьмі гуляць у настольныя гульні. А яшчэ любім прагулкі па нашаму Нясвіжскаму парку.

**«Мая мара — перайсці на безадзнакавую сістэму, бо адзнакі, на маю думку, перашкаджаюць вучням быць на ўроку свабоднымі».**

***— У школе вучацца два пакаленні: пакаленне Z і пакаленне Alfa (дзеці, якія нарадзіліся пасля 2010 года). Ці адчулі вы ўжо розніцу? Чым вас здзіўляюць сучасныя дзеці?***

— У мяне вучні, так бы мовіць, на самы розны густ: пасля ўроку ў трэцім класе я іду да адзінаццацікласнікаў. А яшчэ ў мяне ёсць пяцікласнікі і дзевяцікласнікі. І мне трэба прадумаць заняткі так, каб зацікавіць дзяцей з улікам іх узросту, а гэта зусім розныя ўрокі. Як у класнага кіраўніка ў мяне было ўжо тры выпускі. Апошні — гэтым летам, а з верасня мне даручылі пяцікласнікаў. Я, напэўна, пажыццёвы класны кіраўнік *(смяецца)*. Так, дзеці змяніліся, але мне цікава і з малымі, і з дзецьмі сярэдняга ўзросту, і са старшакласнікамі. Я ўвогуле люблю, калі вучні мяне здзіўляюць. З пяціклашкамі і цікава, і складана адначасова. Для мяне гэта сапраўдны выклік. Іх трыццаць чалавек, яны гарэзнікі, вельмі жвавыя. У пачатковай школе ім не пашанцавала — змянілася пяць настаўнікаў, таму зараз працую над тым, каб сфарміраваць з іх калектыў. Спадзяюся, атрымаецца. Мае вучні вельмі розныя, але тым цікавей. Заўважыла, што дзеці тонка адчуваюць мой настрой, асабліва старэйшыя. Калі навальваюцца нейкія праблемы, яны пытаюцца, што здарылася, прапануюць дапамагчы, спачуваюць, імкнуцца мяне не засмучаць, і гэта вельмі кранае.

***— І ўсё ж якія выпускнікі павінны выходзіць са школы?***

— Людзі, якія крытычна ацэньваюць усё, што адбываецца навокал, не баяцца выказаць сваю думку і паважаюць меркаванне іншага, могуць прыняць чужую пазіцыю, нават калі з ёй не згодныя, могуць аргументаваць свой пункт гледжання і даказаць, чаму яны думаюць менавіта так ці інакш. Я гатова пералічваць і іншыя важныя soft skills (мяккія навыкі), але крытычнае мысленне павінна стаяць на першым месцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Без купюр

# ЗГОДНА З ФАКТАМІ

## Расійскія архівісты запрасілі беларускіх калег далучыцца да работы над выданнем, прысвечаным 75-годдзю Нюрнбергскага працэсу

**Архівісты дзвюх краін і раней плённа супрацоўнічалі, але за апошні час штуршкоў для новых сумесных даследаванняў стала яшчэ больш. У верасні ў Магілёве адбылося сумеснае пасяджэнне калегій Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь і Федэральнага архіўнага агенцтва Расійскай Федэрацыі. «Магілёўшчына, як памежжа з Расіяй, актыўна ўзаемадзейнічала са сваім блізкім суседам у розныя эпохі, — адзначыў падчас сустрэчы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА. — А зараз, калі працэс фарміравання асноў Саюзнай дзяржавы паскорыўся, сувязі павінны стаць яшчэ больш трывалымі».**



Ёсць меркаванне, што гісторыя — гэта палітыка, што яе нават перапісваюць пад сябе. Але дакументы — рэч надзейная. Архіўныя крыніцы ў гэтым сэнсе — сапраўдны Кландайк. За апошнія 10 гадоў сумеснымі намаганнямі беларускіх і расійскіх архівістаў выдадзена парадку 25 зборнікаў, у тым ліку за кошт сродкаў Расійскай Федэрацыі. І гэта не нейкая там навукова-папулярная інфармацыя, а цалкам пацверджаная дакументальнымі крыніцамі. Сёння больш увагі ўдзяляецца перыяду Вялікай Айчыннай вайны, бо ў свеце робіцца спроба сказіць гісторыю і прыменшыць маштабы трагедыі.

— У адным з праектаў мы ўпершыню паказваем сюжэты 17 верасня 1939 года, усё, што папярэднічала 22 чэрвеню 1941-га, — звяртае ўвагу **кіраўнік Федэральнага архіўнага агенцтва Расійскай Федэрацыі Андрэй АРТЫЗАЎ.** — Дакументы нашых беларускіх калег таксама размяшчаюцца на партале Прэзідэнцкай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу, дзе тысячы ўнікальных наведвальнікаў. З тэмай вайны звязаны і праект «Без тэрміну даўніны». У Расіі выйшлі два вялікія федэральныя тамы і яшчэ 23 па кожным рэгіёне, якія былі пад акупацыяй.

— Калі расіяне сталі рыхтаваць гэтыя зборнікі, прапанавалі нам далучыцца, — дадае **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Віктар КУРАШ.** — І мы выдалі тры зборнікі дакументаў па Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях, дзе паказаныя ўсе тыя злачынствы, што адбываліся на гэтых землях падчас акупацыі. Тэрытарыяльна тады межы былі крыху іншыя.

Падчас сустрэчы архівістаў адбылася прэзентацыя гэтых зборнікаў дакументаў. **Кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» і аўтар шматлікіх дакументальных кніг пра вайну Мікалай БАРЫСЕНКА** высока ацаніў такое супрацоўніцтва.

— Любая сустрэча архівістаў — гэта крок насустрач, — лічыць ён. — Абмен фондамі, інфармаванне пра тое, што захоўваецца ў архівах, — найважнейшы складнік для любога даследчыка. Я прагледзеў кнігу «Без тэрміну даўніны» па Магілёўскай вобласці і вельмі ўражаны. Яе каштоўнасць у тым, што тут упершыню сабраныя разам першакрыніцы па генацыдзе, знішчэнні нашых грамадзян. Не трэба вывучаць дзясяткі іншых выданняў. Важна, што тут лічбы рэальныя, не скажоныя, складзеныя на аснове фактаў надзвычайных камісій па даследаванні страты, якую нанеслі фашысты падчас вайны. Гэта акты 1944 года, а не 1960-х, якімі мы ў асноўным карысталіся. Асабіста для нас было адкрыццём даведацца, што захаваліся спісы ахвяр Лупалаўскага лагера смерці, які знаходзіўся ў Магілёве. І гэта бясцэнная інфармацыя, бо мы лічылі, што яна страчаная. Вопытны пошукавік шмат гадоў працуе ў расійскіх архівах, ведае, наколькі карысная і важная там для беларусаў інфармацыя. Апошнім часам стала яшчэ больш дакументаў, з якіх зняты грыф сакрэтнасці. Адзіная праблема — копіі дакументаў каштуюць вельмі дорага.



Магілёўскія музейшчыкі таксама зацікаўлены ў атрыманні копій дакументаў, якія датычацца перыяду Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Расійскай арміяй у Магілёве. І праблема зноў-такі ў грошах. На сустрэчы архівістаў яны звярнуліся да расіян з просьбай дапамагчы. Абяцалі разгледзець пытанне, але ж не хавалі, што таксама заклапочаны ў пошуках сродкаў. Дарэчы, адна з тэм, якую беларусы з расіянамі абмеркавалі на калегіі, менавіта пазабюджэтная дзейнасць. Яна павялічваецца, але ўсё ж такі асноўныя сродкі на захаванне дакументаў паступаюць з бюджэту.

У сумесныя планы архівістаў уваходзіць стварэнне і развіццё навукова-даведачнага апарату, які б дазволіў удасканаліць існуючую сістэму і зрабіць яе больш даступнай. Гэтую тэму прадстаўнікі навукова-даследчых інстытутаў і буйных архіваў Беларусі і Расіі абмеркавалі падчас пасяджэння круглага стала. У выніку аднаго з найбольш удалых беларускіх праектаў быў створаны ўнікальны сайт partizany.by пра подзвігі і лёс партызанаў. Удзельнікі сустрэчы змаглі таксама азнаёміцца з аднайменным інтэрактыўнай выстаўкай — алічбаванымі дакументамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і электроннымі карткамі, якія складзены на іх аснове. На партале з аднайменнай назвай болей чым 190 тысяч персанальных даных партызан. Выстаўка са змяненнямі экспануецца ўжо некалькі гадоў. «Яна пабывала нават за мяжой, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Андрэй ДЗЕМЯНЮК.** — У Падмаскоўі на конкурсе яна заняла трэцяе месца. Зараз мы яе паказваем ва ўстановах адукацыі.

Да 7 кастрычніка выстаўка будзе знаходзіцца ў МДУ імя А. А. Куляшова, затым перамесціцца спачатку ў Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, затым — у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій, а адтуль — у Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках.

У найбліжэйшыя планы расійскіх архівістаў уваходзіць выданне, прысвечанае 75-годдзю Нюрнбергскага працэсу. Яны запрасілі беларускіх калег далучыцца да справы.

— І мы абавязкова дапаможам дакументамі, — запэўніў Віктар Кураш. — Наогул, у нас вельмі багаты фонд, ён складае 13 285 тысяч адзінак захавання. Калі палічкі перавесці ў кіламетры, атрымаецца 214 кіламетраў — прыблізна як ад Мінска да Магілёва. Мы зацікаўленыя ў тым, каб як мага болей данесці праўдзівай інфармацыі да беларускага і расійскага насельніцтва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота з сайта mogilevnews.by**

# Гісторыя ўніверсітэта — у аўтобусе

## Да 100-годдзя БДУ ў сталіцы запусцілі экскурсійны маршрут № 100

**Гэтая акцыя дазволіць пазнаёміць жыхароў і гасцей сталіцы з гісторыяй першага і найстарэйшага ўніверсітэта Беларусі, а таксама аб'яднаць усіх, датычных да святкавання 100-гадовага юбілею альма-матар. Маршрут і нумар аўтобуса абраны невыпадкова. Дзесяцікіламетровы шлях ахоплівае ключавыя гістарычныя месцы, дзе ў розныя гады адбываліся падзеі, якія вызначылі развіццё ўніверсітэта, а нумар маршрута сімвалічна звязаны з юбілейнай датай.**

Пазнаць знакавы транспарт можна будзе па спецыяльнай шыльдачцы «100 Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту. Экскурсійны маршрут». Унутры салона аўдыягід раскажа пра 12 унікальных і малавядомых фактаў з гістарычнай хронікі БДУ, якія прагучаць на адрэзку ад плошчы Калініна да вуліцы Чкалава і ў адваротным напрамку. Так, на прыпынку «Дом друку» пасажыры даведаюцца аб ролі БДУ ў станаўленні Акадэміі навук Беларусі. Каля Купалаўскага тэатра прагучыць гісторыя аб падпісанні ў гэтым будынку важных для БДУ дакументаў. Аўтобус правязе таксама па месцах, дзе ў даваенныя гады знаходзіліся карпусы ўніверсітэта. Пасажырам раскажуць пра выкладчыцкую дзейнасць у БДУ Якуба Коласа, будаўніцтва ўніверсітэцкага гарадка і іншыя цікавыя факты.

Экскурсійную праграму распрацавалі супрацоўнікі і студэнты гістарычнага факультэта БДУ, тэкст аўдыягіда агучыў магістрант факультэта журналістыкі ВНУ Максім Цюцянькоў. Каардынатарам праекта выступае ўпраўленне па выхаваўчай рабоце з моладдзю ВНУ.

Юбілейная «сотка» будзе курсіраваць да канца кастрычніка.

Сумесны праект з Мінсктрансам стаў своеасаблівым падарункам галоўнай ВНУ краіны да яе векавога юбілею.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


*ООО «Центр Белинвентаризация»*
*г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1*

- ✓ Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- ✓ Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- ✓ Пересчет долей в связи с изменением капитального строения

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества ОАО НТК «АЛЕСЯ», тел. 8 (0232) 29 51 12**

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение (торговое помещение) с инв. № 350/D-362070, площадью 91,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Григория Денисенко, 4-4.** Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000006005128 площадью 0,1063 га | **182 400,00** | **18 240,00** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 19 октября 2021 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **21 октября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 02.10.2021 г.* |
| **Условия продажи** | Объект продается в собственность. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами и общественного питания. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Победителю аукциона предоставляется рассрочка платежа на 6 (шесть) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 17.07.2021 г. |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**



**ЗАО «БелБанкротАукцион»,** организатор торгов по продаже имущества ОАО «РСП-12» (УНП 500011281), объявляет о проведении **03.11.2021 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/09/spisok-imushhestva-rsp12-na-torgi-03.11.21.pdf

**Местонахождение имущества:** Гродненская область, Кореличский район., г. п. Кореличи, ул. Гастелло, д. 54.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «РСП-12», тел. +375293667568.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **02.11.2021 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 04.10.21 г.** по **17.00 02.11.21 г.** на bankrottorg.by. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения.
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор: по лотам №№ 39, 99 – 3 % от цены реализации предмета торгов; по лотам №№ 41, 42, 44, 45 – 5 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

Арэнда жылой нерухомасці

# Попыт падае, але цэны ўпарта трымаюцца

## Праўда, тыя, хто самастойна здае кватэру, згаджаюцца на істотныя зніжкі

**Сезон павышанага попыту на арэнду кватэр у сталіцы напярэдадні новага вучэбнага года ў жніўні і ў верасні звычайна дасягае свайго піку, аднак сёлета студэнцкага ажыятажу не адбылося.**
**Як адзначае партал REALT.BY, колькасць пошукавых запытаў «зняць кватэру ў Мінску» ў жніўні аказаўся на 9 % ніжэйшай, чым у ліпені. У верасні актыўнасць будучых жыхароў знізілася яшчэ на 5 %. Па вопыце мінулых гадоў, у наступныя месяцы сезона цікавасць да арэнды кватэр працягне зніжацца аж да навагодніх свят.**



### ПРАПАНОВА ЗАШКАЛЬВАЕ

У той жа час свабоднымі для засялення на працягу месяца сумарна былі 11,2 тысячы кватэр, што на 4 % больш, чым за ўвесь ліпень. Асабліва ў параўнанні з мінулым месяцам павялічылася колькасць трохпакаёвых кватэр — на 6 %. Колькасць аб'яў аб арэндзе адна- і двухпакаёвых кватэр вырасла толькі на 3 % у абодвух выпадках. Варта заўважыць, што паказчык свабодных кватэр вырас да 10 тысяч і больш, толькі ў другой палове гэтага года. Летась на рынку доўгатэрміновай арэнды прысутнічала ад дзвюх да чатырох тысяч свабодных кватэр. Такое істотнае павелічэнне, хутчэй за ўсё, звязана з тым, што канчаткова «асеў» рынак кароткачасовай арэнды кватэр — на суткі.

Характэрна, што большасць свабодных кватэр, якія прапаноўваюцца пад арэнду, стаяць пустымі ўжо досыць доўгі час. Так, на сайце hata.by ёсць кватэры, якія праглядалі патэнцыйныя кватаранты па некалькі тысяч разоў. Гэта сведчыць пра тое, што рынак арэнды сапраўды «перагрэўся» і патрабуе цэнавай карэкціроўкі.

### СЯРЭДНІЯ ЦЭНЫ ТРЫМАЮЦЦА, РЭАЛЬНЫЯ ПАЧЫНАЮЦЬ ПАДАЦЬ

Спачатку разбяромся, што было на рынку ў жніўні. На фоне злёгку павышанага попыту ў апошнім месяцы лета большасць арэндадаўцаў павялічылі цэны, аднак не так істотна, як у мінулыя гады. Па сутнасці, стаўкі арэнды на кватэры ў Мінску з пачатку года мяняліся неістотна: ад месяца да месяца рост альбо зніжэнне не перавышала 1 %.

На канец жніўня сярэднія цэны арэнды кватэр у Мінску выглядалі наступным чынам:

— аднапакаёвыя кватэры — 275 долараў (рост на 0,7 %);

— двухпакаёвыя кватэры — 337 долараў (рост на 0,3 %);

— трохпакаёвыя кватэры — 415 долараў (зніжэнне на 0,2 %).

Нас больш цікавіць абстаноўка са стандартным жыллём у верасні. Бюджэтныя арэндныя кватэры здаюцца злёгку па іншых цэнах. Тут аднапакаёвыя кватэры здаюцца ў сярэднім па 250 долараў, але сустракаюцца і варыянты невысокай якасці памяшканняў, дзе аб'екты прапануюцца нават за 200—230 долараў. Гэта, як правіла, кватэры са старой мэбляй у Заводскім раёне і Шабанах. Але самыя танныя кватэры сёння ёсць у новабудоўлях — за 190 долараў. Гэта невялікае жыллё (33—38 квадратных метраў) абсталявана толькі часткова. Як правіла, у такіх кватэрах электрычная пліта на кухнях, а на дваровых тэрыторыях дома ў непагадзь хадзіць можна выключна ў ботах. Каля гэтых дамоў яшчэ паўгода дарабляюцца пешаходныя дарожкі і ўдакладняецца графік руху грамадскага транспарту.

Двухпакаёвая кватэра ў бюджэтным варыянце будзе прапаноўвацца за 230 долараў. Гэта ў асноўным «хрушчоўкі» ў старых дамах мінулага стагоддзя або часам прасторныя апартаменты ў дамах-новабудоўлях. З мэблі ў старых дамах — выключна савецкі варыянт, а ў новабудоўлях — наогул нічога. Варта заўважыць, што пры бюджэтным варыянце магчымыя падводныя камяні. Такія, як вечна п'яны сусед, пастаянна няспраўны смецціправод або назойлівыя «пах» ката ў далёкім куце пад канапай. Гэтыя несправльныя ўмовы выкрываюцца ўжо пасля засялення ў кватэру.

### БЕЗ ДАГАВОРА МАГЧЫМЫЯ ПРАБЛЕМЫ

Пры арэндзе кватэр часта ўсплываюць розныя пытанні, якія могуць сапсаваць жыццё не толькі арандатару, але і ўладальнікаў нерухомасці: разнастайныя нявыплаты, псаванне і крадзеж маёмасці, сваркі з суседзямі і многае іншае. Плюс пры адсутнасці дагавора арэнды магчымыя штрафы з падатковай. Дагавор арэнды дазваляе абодвум бакам адчуваць сябе больш абароненымі ў прававым сэнсе. Так, і ў суд ёсць з чым звярнуцца ў канфліктных сітуацыях. Між тым у Жыллёвым кодэксе прапісаны ўсе нормы, патрабаванні, правы і абавязкі бакоў. Што трэба ведаць?

Для найму жылога памяшкання дагавор, складзены ў адвольнай форме двума бакамі, не падыдзе. Неабходна па правілах запоўніць тыпавы бланк дагавора, афіцыйна запоўніць яго і аплаціць падатак. Бланкі тыпавога дагавора найму жылога памяшкання лёгка знайсці ў інтэрнэце альбо атрымаць у разлікова-даведачным цэнтры (ЖЭС). Атрымаўшы на рукі бланк, важна правільна яго запоўніць. Неабходна ўнесці ў дагавор тэрмін аплаты і памер аплаты жылля, плату за камунальныя выдаткі, заклад і магчымыя змены ў аплаце. Абавязкова трэба ўпісаць правы і абавязкі абодвух бакоў, а таксама абставіны і падставы для высялення.

Дагавор арэнды абавязкова запаўняецца ў пісьмовым выглядзе ў трох экзэмплярах для: арэндадаўца, арандатара і арганізацыі, у якой будзе зарэгістраваны дагавор. Дата засялення новых жыхароў павінна супадаць з датай рэгістрацыі дагавора, таму што яна з'яўляецца пачаткам дзеяння пагаднення. Яшчэ дагавор варта зарэгістраваць. У Мінску гэтая працэдура адбываецца ў разлікова-даведачных цэнтрах (РДЦ). Для рэгістрацыі дагавора неабходная прысутнасць абодвух бакоў з пашпартамі. Не забудзьцеся скласці акт прыёмкі-здачы нерухомасці з указаннем дакладнага пераліку маёмасці, яго кошту і выгляду (вітаецца фота — і відэаздымка як доказ).

Дарэчы. Вызваляюцца ад падаходнага падатку грамадзяне, якія здаюць жыллё маладым спецыялістам і блізкім сваякам. Але тады ў падатковую службу неабходна аднесці копію працоўнай кніжкі маладога спецыяліста і копію пасведчання аб накіраванні на працу маладога спецыяліста альбо дакумент, які пацвярджае блізкае сваяцтва з кватарантам.

### ГРОШЫ ЛЕПШ КЛАСЦІ НА РАХУНАК УЛАДАЛЬНІКА

Аўтар гэтых радкоў палову жыцця здымаў кватэру, а пазней і сам жыллё здаваў. Таму не па чутках ведае аб усіх нюансах жыллёвай арэнды. Вось некалькі парад.

Не заключайце бестэрміновы дагавор. Калі ваш жыхар раптам збяжыць, то дагавор аб скасаванні дагавора з ім не падпішаш, а значыць, і падаходны падатак прыйдзецца працягваць плаціць альбо ісці ў суд. Больш за тое, не трэба заключаць дагавор больш чым на год. У мяне быў выпадак, калі кватаранты нечакана з'ехалі, пасля чаго я плаціў падатак за пустую кватэру амаль цэлы год.

Па-другое. Прапісваць у дагаворы суму аплаты па законе можна толькі ў беларускіх рублях. Але прывязку лепш зрабіць да сумы ў замежнай валюце і яе курса на дзень плацяжу.

Важна. Нельга здаваць жылую нерухомасць, набытую (пабудаваную) за кошт ільготнага крэдыту да яго поўнага пагашэння, калі гэта не дазволена мясцовым адміністрацыйным органам. Акрамя таго, нельга здаваць у якасці жылой нерухомасць, якая патрабуе капітальнага рамонту, а таксама падвальныя і паўпадвальныя памяшканні.

Па дагаворы найму нельга зняць альбо здаць долю ў кватэры, таму што яна не з'яўляецца жылым памяшканнем. Здаецца альбо пакой (пакоі), альбо ўсё жыллё.

Яшчэ парада з асабістага вопыту. Не працуйце з «шэрай гатоўкай». Пералічвайце аплату арэнды жылля на рахунак уладальніка кватэры. Гэта зберажэ вас ад магчымых прэтэнзій і прасцей будзе потым даказаць у судзе факт аплаты. А пры з'яўленні дадатковых умоў з любога боку магчыма ўнясенне змяненняў па пагадненні бакоў з наступнай рэгістрацыяй змяненняў у тым жа парадку, што і рэгістрацыя дагавора.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Здарэнні

## НА КРАДЗЕЖ — З САМАРОБНАЙ «ГЛУШЫЛКАЙ»

**У дзяжурную часць Мінскага РУУС паступіла паведамленне аб рабаванні з крамы адзення ў гандлёвым цэнтры «Яскравы». Адміністратар гандлёвага аб'екта расказаў, што звярнуў увагу на мужчыну, які каля паўгадзіны шпацыраваў, выбіраючы ўпадабаныя джэмперы і складваючы іх у партфель.**

Адміністратар падумаў, што, выходзячы з крамы, пакупнік разлічыцца, тым больш што крама была абсталявана так званай антыкрадзежнай сістэмай — на ўсе джэмперы былі прымацаваны спецыяльныя чыпы, а на выхадзе ўстаноўлена рэагуючая на іх пранос рамка-дэтэктар. Мужчына ніякіх маніпуляцый з чыпамі на джэмперах не праводзіў, таму прадавец і быў упэўнены, што пакупнік расплаціцца. Аднак той, склаўшы ў партфель чатыры джэмперы, накіраваўся міма касы наўпрост да выхаду. Мужчына паводзіў сябе спакойна, нібы і не спрабаваў пранесці праз рамку «чыпіраваныя» джэмперы на амаль дзвесце рублёў.

Калі рамка запішчала, дык больш за ўсіх здзівіўся «пакупнік». Пасля секунднай збянтэжанасці ён кінуўся наўцёкі ад супрацоўніка крамы. Зламысніку ўдалося ўцячы. Выкрадзеныя джэмперы былі знойдзены на вуліцы побач з гандлёвым цэнтрам.

У ходзе правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі крымінальнага вышуку Мінскага РУУС высветлілі асобу і затрымалі падазраванага ў здзяйсненні рабавання. Ім аказаўся 34-гадовы беспрацоўны гараджанін, раней неаднаразова судзімы за крадзяжы. Як растлумачыў затрыманы, выкрадзеныя джэмперы ён выкінуў, бо баяўся, што з імі яго дагоніць ахова.

Пасля агляду партфеля затрыманага стала зразумела, чаму яго не бянтэжыла антыкрадзежная сістэма крамы. У ім быў знойдзены экранаваны фальгой пакет, які, на думку яго «распрацоўшчыка», павінен быў глушыць датчыкі. Перад паходам па джэмперы мужчына правёў «палявыя выпрабаванні» сваёй сістэмы ў размешчанай непадалёк прадуктовай краме: вынес у партфелі ўпакоўку дзіцячага харчавання, прамаркіраваную спецыяльнымі чыпамі. У тым гандлёвым аб'екце антыкрадзежная сістэма не спрацавала, і, акрылёны поспехам, зламыснік вырашыў «падняць стаўкі».

У выніку да дробнага крадзяжу дадалося рабаванне і перспектыва правесці найбліжэйшыя шэсць гадоў на поўным дзяржзабеспячэнні, рэзюмуе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Мінскага РУУС.

## АДДАЎ АШУКАНЦАМ БОЛЬШ ЗА 11 ТЫСЯЧ

### Мужчына з Маладзечна ўзяў іх у крэдыт у трох банках

**45-гадовага гараджаніна тэлефонныя аферысты перакаралі, што хтосьці аформіў ад яго імя крэдыты ў розных гарадах Беларусі і адмяніць іх магчыма такім жа спосабам. Схема ануявання пазык простая: трэба ўзяць новыя крэдыты і паведаміць рэквізіты банкаўскіх картаў, на якія паступалі грошы.**

Падрабязнасці паведамляе група інфармацыі і грамадскіх сувязяў Маладзечанскага РАУС. Так, мужчыну з невядомага нумара паступіў званок нібыта ад супрацоўніка службы бяспекі банка. Суразмоўнік пацікавіўся ў кліента, ці не губляў ён сваю банкаўскую картку і пашпарт, бо быццам бы з карткі здзяйсняюцца грашовыя пераводы на прозвішча нейкага грамадзяніна, з якім сам трымальнік «пластыку», як высветлілася, незнаёмы. Тады суразмоўнік папрасіў назваць рэквізіты банкаўскай карты нібыта для яе блакіравання ў мэтах недапушчэння крадзяжу з рахунку, што мужчына і зрабіў.

Далей з маладзечанцам размову працягнуў іншы супрацоўнік, які паведаміў пра тое, што ў банках Мінска, Ліды і Магілёва нехта, паказаўшы яго пашпартныя даныя, забраніраваў крэдытныя сродкі на агульную суму ў 21 тысячу рублёў. Каб пазбегнуць крэдытных абавязацельстваў, мужчыну неабходна на самай справе аформіць пазыку.

Пацярпелы павёўся на выкрут аферыстаў і выконваў усё, што ад яго патрабавалі зламыснікі. У адным з банкаў Маладзечна мужчына аформіў крэдыт на 5000 рублёў і ў ходзе тэлефоннай размовы назваў ашуканцам рэквізіты карты, на якую была пералічана гэтая сума. Затым, прытрымліваючыся інструкцыі, ён адправіўся ў іншую фінансавую ўстанову, дзе яго пракрэдытавалі на суму 3381 рубель.

Праз тры дні сітуацыя паўтарылася, і гараджанін такім жа чынам аддаў невядомым 3000 рублёў. Мужчына быў настроены аформіць яшчэ адзін крэдыт, нават пад заклад сваёй кватэры, але ў гэтым выпадку ў банку яму адмовілі. Пасля гэтага лжэспецыялісты перасталі выходзіць на сувязь. Праверыўшы баланс, маладзечанец выявіў, што ніякіх грошай — агулам 11 381 рубель — на картках няма, і звярнуўся з заявай у праваахоўныя органы.

Па дадзеным факце следчымі заведзена крымінальная справа. Праваахоўнікі праводзяць мерапрыемствы па ўстанаўленні ўсіх абставін таго, што адбылося, і асоб зламыснікаў.

## АЎТАЗАПЧАСТКІ МІМА КАСЫ

**У Партызанскі РУУС сталіцы звярнуўся ўладальнік аднаго са сталічных магазінаў па продажы аўтазапчастак з заявай аб тым, што па выніках інвентарызацыі выяўлена нястача.**

У ходзе правядзення аператыўнікамі праверачных мерапрыемстваў было ўстаноўлена, што 29-гадовы мінчанін, з'яўляючыся прадаўцом указанай крамы, прадаваў тавар, не выдаючы касавы чэк, а атрыманыя грошы ад продажу тавару прысвойваў сабе.

Са слоў затрыманага, выкрадаў такім чынам грошы на працягу трох гадоў. Сума шкоды склала больш чым 7800 рублёў, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням мужчыны і распачалі крымінальную справу за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 34 (560)

# Жоўтае полымя, шэрая нуда...

## Восень у творах класікаў



*Воплескі даланёю*
*адною:*
*лунае*
*кляновы ліст над зямлёй.*

Так убачыў выдатны паэт Алесь Разанаў, які нядаўна сышоў ад нас, восеньскую пару...

Здавалася б, час, калі ўсё сцішваецца ды вяне... А натхненне паэтаў ды пісьменнікаў якраз квітнее.

Вядомы даследчык Алесь Бельскі падлічыў пры складанні частотнага паказальніка асноўных пейзажных тэм, вобразаў і матываў беларускай літаратуры, што ў 10 320 творах 150 паэтаў вясна згадваецца 978, восень — 908, зіма — 615, лета — 313 разоў.

Як бачыце, восень амаль даганяе вясну па запатрабаванасці ў літаратараў... Хоць бачаць яе па-рознаму. Алесь Адамовіч пісаў сябру Янку Брылю ў 1957 годзе на Нарач: «У нас тут ні то восень, ні то атамная радыяцыя — поскудзь, а не пагода. Можа, у вас там каля вялікай вады тое, што з неба льецца, не так ужо перашкаджае жыць».

І каб пейзажы за вокнамі гэтай парой не наганялі нуду, як на аўтара вышэй працытаванага ліста, давайце падсвецім іх фантазіяй класікаў.

### Восень натхняльная

Дарэчы, чаму для літаратараў восень — пара плённая, даў адказ Уладзімір Караткевіч у рамане «Нельга забыць». Аднакурснік галоўнага героя, паэта Андрэя Грынкевіча, па Літаратурным інстытуце, латыш Яніс, мае рэальны правобраз — гэта паэт Еранім Стулпан, які сябраваў з Караткевічам падчас вучобы на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. Пра яго гаворыцца наступнае:

«Яніса амаль цэлы месяц не было ў Маскве. Быў у Рызе. Сам зняволіў сябе ў Доме творчасці і пісаў там новую паэму. Яму лепей за ўсё пісалася позняй восенню, у лістападзе, калі над зямлёю нізкае шэрае неба, туман ляжыць на верхавінах дрэў і нават апалая лістота паспела згубіць свой залаты колер і стаць грыфельна-шэрай. Ён проста быў моцны і жыццярадасны чалавек. А такія любяць восень. І любяць працаваць увосень, таму што ў астатнія поры года жыць хочацца больш, чым пісаць».

Зрэшты, у гэтым рамане шмат восеньскіх пейзажаў, якія робяцца фонам для развіцця нялёгкай любоўнай гісторыі:

«Дзень выдаўся ясны і празрысты для сярэдзіны лістапада. Сквер, пабіты ранішнікамі, толькі сям-там трапятаў паасобнымі, счарнелымі ўжо, лісцямі. І ўмыта, прасветлена-сумна ляжала над белымі лужынкамі, над пацямнелымі з сонечнага боку храпамі шэрай мёрзлай зямлі, над нежывымі дрэвамі халоднае блакітнае неба.

У Андрэя было нялёгка на душы. Нялёгкай была нядаўняя гісторыя з Ірынай, шкада было Ганны».

### Восень гаротная

Калі вясна для многіх беларускіх паэтаў — сімвал адраджэння, то восень служыла найлепшым фонам для плачу аб гаротным жыцці мужыка. У паэме Янкі Купалы «Адвечная песня», дзе сімвалічна апісаны год таго беларускага мужыка, раздзел «Восень» пачынаецца так:

«Досвітак. Ток. Бледна курыцца на сцяне газоўка. Мужык малоціць. Цэп гудзе. Яму, глуха заводзячы, падцінае вецер. Дзверы адчыняюцца, уваходзіць Восень. У адной руцэ трымае пук усялякіх павялых зёлак, у другой — пусты мех».

Мужык давай, як яму належыць, скардзіцца:

*Восень, ясная пані,*
*Глянь! я лгаць не хачу —*
*Да паўзімкі не стане,*
*Як лічу, не лічу.*

*Няма штосьці ўмалоту,*
*Ды і што малаціць?*
*Копкі дзве акалоту,*
*Грэчкі з возік ляжыць.*

А паколькі ў сям'і сямёра дзетак, будзе зіма галодная... І восень «выходзіць. На двары вецер вые шторазмацней. Каплі сцюдзёнага дажджу шлёпаюць аб гнілыя сцены. Мужык набірае ў рэзгіны вязку саломы і ідзе даваць скаціне. Дзверы са скрыпам зачыняюцца».

### Восень, якая дае надзею

Затое ў паэтэсы Канстанцыі Буйло восень — сімвал жыццёвых выпрабаванняў, якія не зламаюць моцнага чалавека.

Што ж, выпрабаванняў хапала: першы зборнік юнай Канстанцыі «Курганная кветка», які выйшаў у 1914-м, рэдагаваў Янка Купала... Наступны выйшаў у 1950-м. Паміж гэтымі датамі — нараджэнне сына, страта мужа ў сталінскіх лагерах, другое замужжа, жыццё далёка ад радзімы... Гэты верш Буйло напісала ў 1966-м як пэўны жыццёвы падрахунак:

*Сарвала восень*
*з дрэваў лісце,*
*Іх вецер круціць у віры,*
*Як лёс круціў людзей*
*калісьці*
*У далёкай, сумнае пары.*
*А вось не сумна мне*
*сягоння,*
*Бо, дзе трымаліся лісты,*
*Пупышкі ў рост сук голы*
*гоніць,*
*І ён не мёртвы, як кастыль.*
*Ўсё, што жывое,*
*будзе жыва.*
*А вецер мёртвае мяце...*
*Вясною, з новых сіл*
*прылівам*
*Наш сад магутна зацвіце.*
*Так і душа... Не дайся болю*
*І думы гордыя спялі, —*
*І не загіне, вер, ніколі*
*Ўсё, што ты зробіш*
*на зямлі.*

### Восень рэфлексіўная

Герой аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы» — гэткі тыповы беларус, які рэфлексуе над сваім месцам у жыцці... З яго нараджэннем звязаная таямніца ў стылі антычных трагедый: маці, простая жанчына, немаўлём памяняла яго з панічам: «І душа дваіцца. Дзве душы. Тая, што плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі, цяпер цвярдзее, але робіцца нядобраю, набірае ўсё болей нейкай калянасці і нават жорсткасці».

Максім Гарэцкі — майстар псіхалагічнага пейзажу, гэта ж ён не аб прыродзе — аб людской душы піша:

«Бывае так, што сярод холаду, шэрасці, пустэльнасці і нуды асенняй прыроды, сярод прыкрага надвор'я самай познай восені на небе неяк неўпрыцям прагаліцца маленькі сіненькі лапічак — адзін, другі, трэці. Вось ужо не малая частка неба вызваляецца з-за хмар, сіняя, радасная; яшчэ лёгка плывуць па яе берагох прыгожыя фарботы цёмных пасяродку і белых наўкол болачак. Яшчэ вісіць чорная, палавая туча далёка-далёка над лесам, як слова яна там дужа добра ўчапілася. А зірніце, зірніце скарэй, як вун там шпарка пасунулася астатняя срэбная хмарка цераз сонца; блеснуў з неба першы сноп светлага калосся на крыллі пруда-ветрака; перабег залатой пасцілкаю цераз папоў сад — і ўсё весялеець, робіцца прыгожым; ціхенька варухнуліся галінкі на старой бярозе, убачыўшы сонца, і мякчэйшай хоча быць мёрзлая груда пад нагамі дзяўчыны, што схапіла вёдры, бяжыць вады, бяжыць і нечага смяецца, а сонейка забылася, забавілася, любуецца на дзявоцкае прыгажства.

Бывае так.

А там ізноў — шэрая нуда».

### Восень хвалюючая

Гераіня «Палескай хронікі» Івана Мележа Ганна Чарнушка, вясковая дзяўчына, перажыўшы расчараванне ў каханні, страціўшы дзіця, таксама адкрывае ў сабе здольнасць да рэфлексіі. Выбірае бульбу, аж пальцы чорныя, а сама мроіць...

«У лагодным сонечным святле гарэлі сумным адвечным полымем ліпы і бярозы каля хат, дрэвы ў недалёкім лесе. Як сівізна ад былога, ад перажытага, бялела ўсюды павуціна. Яна вісела ў паветры, абчэплівала павялы і пасохлы бульбоўнік, калы і жэрдкі вакол агародаў, пажоўклыя кусты. Усё агартаў спакойны, стары як свет смутак, смутак развітання з цяплом, з летам, набліжэння слаты, халадоў.

На душы ў Ганны ўсе гэтыя дні было самотна і трывожна, не адыходзіў ціхі, цягучы жаль. Душы хацелася шкадаваць — шкада было і добрага, ужо аслабелага сонца, і голых, бедных палёў, і яркіх агністых дрэваў, што вось-вось павінны былі страціць сваю красу.

«Што ето са мной?» — дзівілася не раз яна сваёй чуласці. Раней яна ніколі не адчувала так восені, была безуважная да гэтай пары, нібы і не заўважала. Чаго ж цяпер так хвалюе яе апошняя пяшчота цяпла, згалеласць палёў, смутак асенніх дзён? Чаму ж усё гэта адгукаецца ў сэрцы маркотнай, няўцікнай журлівасцю?»

### Восень расстайная

Героі рамана Івана Шамякіна «Трывожнае шчасце» ўвосень мусяць развітацца — Пятра прызываюць у армію, яго маладая жонка Саша, фельчарка, застаецца на працы ў вёсцы. Расстанне яшчэ больш горкае, бо Саша чакае дзіця.

Прататыпамі герояў былі сам Шамякін і ягоная жонка, Марыя Філатаўна, раман у вялікай ступені аўтабіяграфічны. Пасля гэтага расстання няхутка давядзецца ім убачыцца. Пачнецца вайна... Маладыя сужэнцы не будуць нават ведаць адно пра аднаго, ці жывыя... Марыя народзіць дачку, якую бацька ўпершыню пабачыць толькі праз некалькі гадоў.

«Яны выйшлі ў поле.

Бярозы на могілках стаялі ў жоўтым полымі.

Каляіны дарог былі засыпаны апалым лісцем. На агародах, на бадай што голых ужо вішнях, на прыдарожным быльнягу вісела павуціння бабінага лета.

Пятро хацеў радавацца. Ён жа многа чытаў у розных кнігах, у часопісах, бачыў у кіно, як радуецца моладзь, калі адыходзіць у армію. Чаму ж у яго няма гэтай радасці? Ён падумаў, што, відаць, гэты смутак, які сціскаў яму сэрца, навеяны восенню...

«Навошта прызываюць увосень, калі нават прырода смуткуе, так пуста навокал... павуціннe?.. Няхай бы гэта было вясной, калі ўсё зацвітае, ажывае... Весела было б...»

Ён проста шукаў апраўдання свайму смутку, бо яму было сорамна — хіба ён горшы за іншых? Хіба не імкнуўся ён яшчэ са школьных год у армію, не хацеў паступіць у ваенную школу? Не, ён таксама з гонарам і радасцю ідзе выконваць свой пачэсны грамадзянскі абавязак! А настрой гэты ад таго, што цяжка пакідаць Сашу... Яна застанецца адна сярод чужых... Хутка гэтая бязлесная раўніна пакрыецца снегам. Стане яшчэ больш сумна. Яна адна будзе сядзець доўгімі вечарамі, а ўдзень — хадзіць да хворых...

Поле перад імі ляжала роўнае, голае, толькі з аднаго боку пазірк цешыла маладая рунь азіміны, а з другога — як кінуць вокам — цягнуліся шэрая пожня і чорная ралля. Ніводнай жывой істоты, калі не лічыць адзінокага трактара, што поўзаў удалечыні, на схіле ўзгорка, чорным жуком».

### Восень з дымам бульбоўніка

У Рыгора Барадуліна, майстра метафары, пра восень напісана вельмі шмат нечаканага і цудоўнага... Менавіта ён увекавечыў самы звыклы для беларусаў, амаль сакральны восеньскі пах:

*Калі разыходзяцца лета*
*з восенню палюбоўна,*
*а бульбянішча на зіму яшчэ*
*не пераворана,*
*зграбаюць у кучы,*
*паляць бульбоўнік.*
*Іскры лятуць і блякнуць*
*патухлымі зорамі.*
*Дым спачатку рвецца*
*ўгару,*
*ды перадумвае*
*неўзабаве, —*
*мабыць, лагчынай прайсці*
*захацелася.*
*Барана, што ляжыць*
*дагары зубамі,*
*як вожык той абчаплялася*
*лісцем зжаўцелым.*
*Сланечнік галаву цяжкую*
*праз частакол прасунуў,*
*грэецца —*
*холад даймае патрошку.*
*Лятуць журавы над Ушачай*
*з курлыканнем сумным,*
*ляціць наўздагон ім ціхае:*
*«Пуцём-дарожкай!»*
*На возе едзе мох баравы,*
*запалы лістам, ігліцай,*
*дым следам ідзе,*
*і конь галавою матляе*
*стомлена.*
*З раніцы хмурыцца,*
*хмарыцца,*
*пад вечар — імгліцца.*
*Журавель над студняй*
*прыгнуўся —*
*нізка пад восеньскай*
*столлю.*
*Я гэты ціхі дым*
*на смак*
*і навобмацак*
*ведаю,*
*яго я ні з чым не паблытаю,*
*любой парою,*
*дзе б ні быў,*
*адусюль*
*па ім, як ганчак па следу,*
*дарогу дадому знайду,*
*да матчынага парога.*

Згадзіцеся, чытаючы, нават адчуваеш той непаўторны пах вогнішча...

Так што няхай добрая беларуская літаратура дапаможа вам не сумаваць гэткай восенню!

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**



**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# ТРЫ КІЛАМЕТРЫ НАД УЗРОЎНЕМ НЕБА

## Беларус Віктар Лутаў неаднаразова пабываў там


Віктар ЛУТАЎ.

**Альпінізм — адзін з самых складаных, небяспечных і ў той жа час захапляльных відаў трэкінгу. Горы заўсёды вабілі чалавека магчымасцю выпрабаваць сябе, адчуць незабыўныя ўражанні. Занятки альпінізмам патрабуюць высокага ўзроўню як псіхалагічнай і фізічнай, так і тэхнічнай падрыхтоўкі. Заваяваннем горных вяршынь займаюцца ва ўсіх краінах, у першую чаргу там, дзе такія вяршыні ёсць.**

Распаўсюджаны гэты рух і ў нашай краіне. У 2006 годзе Віктар Лутаў стаў адным з нямногіх беларусаў, за плячыма якіх — заваяванне дзвюх гор вышынёй больш за восем тысяч метраў: Эверэст (8848) і Чо-Ойю (8201) у Гімалаях. Таксама ён удзельнічаў у экспедыцыях на Нанга-Парбат (8126) і Броўд-пік (8051) плюс узяў мноства гор ніжэйшых, хоць і не менш складаных. Цяпер Віктар знаходзіцца ў Беларусі, а пасля таго як вырашыцца сітуацыя з каранавірусам, плануе адправіцца ў Кіргізію, каб дасягнуць чарговай вяршыні. Мы пагаварылі з альпіністам пра ўздым на Эверэст, каласальныя нагрузкі на арганізм, пра неверагодную прыгажосць і яшчэ шмат пра што іншае.

***— Віктар, вы ўсё жыццё ў спорце. З чаго пачалося?***

— Даволі звычайна. Я вучыўся ў школе ў Капылі ў спартыўным класе. Класны кіраўнік Валянціна Сямёнаўна Саўчанка з пачатковых класаў прывучала нас да паходаў. Потым паступіў у радыётэхнічны інстытут (цяпер БДУІР). Таксама спрабаваў займацца паходамі, але часу было мала. Калі ўжо скончыў інстытут, трапіў на «Інтэграл». Акрамя работы, з'явіліся грошы, пачаліся розныя паходы. Там, на «Інтэграле», была секцыя альпінізму і добрая спартыўная база, вельмі моцныя хлопцы, з якімі і пачаліся першыя падарожжы, што спачатку праходзілі ў асноўным на Каўказе, потым ужо Цянь-Шань.

Тады ў Савецкім Саюзе актыўна дзейнічалі альплагеры, альпбазы і вельмі хутка ішоў прагрэс альпіністаў. За чатыры гады навучання мы маглі самастойна рабіць узыходжанні. Вось з гэтага ўсё і пачалося.

***— Якую вяршыню вы пакарылі ўпершыню?***

— Самая першая была вяршыня Ак-Тур, альпійская база Узункол, Заходні Каўказ. 1986 год. Мне было 23 гады.

***— Калі і як вы пакарылі Эверэст?***

— Да Эверэста рыхтаваліся даволі доўга. Гэта была праграма, над якой мы працавалі з 1998 года, — восем гадоў мы вялі падрыхтоўку. Так склалася, што каманда ў нас заўсёды была вельмі згуртаваная. Амаль усе вядучыя спартсмены ў краіне на той час мелі званне «Снежны барс» — заваёўнік усіх сямітысячнікаў. Але ў нас, у нашай групе, гэта не атрымлівалася па розных прычынах. Была перабудова, затым цяжкія 90-я і было няпроста ва ўсіх адносінах: у арганізацыі, грошай было мала. І толькі ў 2004-м, дзякуючы спонсарам, у нас з'явілася магчымасць сабрацца, і мы трапілі на вяршыню Чо-Ойю, Тыбет, 8200 метраў.

Пасля гэтага ўзнікла ідэя здзейсніць больш сур'ёзнае ўзыходжанне. У 2006 годзе сфарміравалася каманда з чатырох чалавек, і мы паспрабавалі падняцца на Эверэст. Усё атрымалася.

***— Якія пачуцці адчувалі, падняўшыся на вяршыню свету?***

— Стан эйфарыі. Тое неапісальнае пачуццё, калі ты вышэй за ўсё, вышэй аблокаў на некалькі кіламетраў. Ты на вышэйшай кропцы свету, і гэта вельмі крута!

***— Колькі прыблізна каштуе ўзыходжанне на Эверэст?***

— Пятнаццаць гадоў таму гэта каштавала прыблізна дзевяць тысяч долараў з чалавека. Гэта дазвол, забеспячэнне базавага лагера, трансфер Мінск — Масква — Катманду — Кітай, пераезд унутры Тыбета, а яшчэ — візы, пропускі, страхоўкі.

Цяпер усё значна даражэй. У лепшым выпадку аддасце 25 тысяч долараў, а рэальная лічба — каля 70 тысяч — камерцыйны прайс.

***— Якія вяршыні вы пакарылі акрамя Эверэста?***

— Наша каманда працавала з 1986 года, гэта больш за 35 гадоў у альпінізме. Таварышаў шмат, якія былі са мной тады. Цяпер іх стала менш. Акрамя Эверэста, ужо потым, у 2007 годзе, рабілі ўзыходжанне на Нанга-Парбат — дзявяты па вышыні васьмітысячнік свету, на паўночным захадзе Гімалаяў. Пасля, у 2008-м, было ўзыходжанне на Броўд-пік, гэта горная вяршыня ў Каракаруме.

***— Ці было вам страшна? Бо вядома шмат выпадкаў, калі людзі гінулі.***

— Было. Але задача альпініста заключаецца ў тым, каб свой страх схаваць унутры, паспрабаваць накіраваць яго ў пазітыўнае рэчышча. Перавесці гэты страх, каб ён цябе не паралізаваў, а прымусіў рухацца, выконваць сваю задачу, нягледзячы на тое, што на шляху могуць сустракацца небяспечныя рэчы. Гэтаму ўвогуле і вучаць альпіністаў без канца. Адна з асноўных задач альпініста — зрабіць так, каб чалавек не баяўся і са страху кудысьці лез, а каб ён прывык, што гэта ў прынцыпе ёсць небяспека аб'ектыўная, але трэба ўсё роўна рухацца, нягледзячы ні на што.

***— Якая падрыхтоўка неабходная для ўзняцця ў горы?***

— Крос хоць бы павінен прабегчы як мінімум 10—20 кіламетраў за паўтары гадзіны *(смяецца)*. Трэба быць фізічна падрыхтаваным, таму што там — стыхія, усё абсалютна адрозніваецца ад таго, да чаго мы прывыклі, жывучы ў горадзе: на транспарце ездзім, тэлевізар глядзім, на канапе ляжым. Гарадскія жыхары прыкаваныя да нейкага маршруту: школа, універсітэт, работа, а фізічнай падрыхтоўкі мала. А там — кардынальна іншае жыццё. І прайсці трэба велізарную дыстанцыю і па гарызанталі, і па вертыкалі.

Неабходна быць фізічна развітым, тады спартыўная падрыхтоўка дае магчымасць сябе адчуваць камфортна і бяспечна ў цяжкіх умовах, атрымліваць задавальненне. Калі падрыхтоўка ў вас слабая, тады рэсурс будзе малы. Вы не можаце доўга ісці, лезці або начаваць у халодных умовах, калі кіслароду няма. Любы спорт дае вам адчуванне гіпаксіі. Кожны чалавек, які бяжыць крос, знаёмы з гэтым. Тое ж самае ў гарах: узнікае гіпаксія з-за таго, што ты падымаешся высока над зямлёй. Таму спорт тут абавязковы, без яго вы проста слабая фігура ў гарах.


Дзяржаўны сцяг — на самай вяршыні.

Цыкл узыходжання сам па сабе няпросты. Падняліся на пяць кіламетраў — адседзеліся. Падняліся на шэсць — зноў адседзеліся. Забраліся на сем — і... спусціліся ўніз. Потым падняліся на 7,5 тысячы метраў — і зноў уніз да пяці тысяч. Гэта значыць, спачатку арганізм нагружаем, і ён пачынае выдыхацца, паміраць. Таму трэба спусціцца ніжэй, насыціцца кіслародам. Адпачылі, арганізм ажыў, набраўся сіл — зноў можна падымацца вышэй. У канцы дабіраецеся да васьмі тысяч метраў. Калі адчуваеце сябе добра — калі ласка, яшчэ менш як 848 метраў — і вы на вяршыні Эверэста.

***— Ці магчыма пакарыць Эверэст у адзіночку?***

— Такія спробы былі. Адзін брытанец, здаецца, у 1925 годзе прыляцеў туды на самалёце. Ён быў фанатычны аматар гор. Як ні дзіўна, падняўся на даволі вялікую вышыню і... загінуў там. Так што аднаго фанатызму мала. Але вось Райнхальд Меснер, італьянскі альпініст, першым заваяваў усе 14 «васьмітысячнікаў» свету, некаторыя з іх у адзіночку, так што гэта ўсё ж магчыма. Праўда, трэба мець выключныя фізічныя якасці, велізарны рэсурс, быць неверагодна моцна падрыхтаваным. Сёння я нават не магу ўявіць, як гэта зрабіць.

***— А што са здарэннямі? Мы з вамі гутарым праз некалькі дзён пасля таго, як у час узыходжання на Эльбрус загінулі адразу пяць расійскіх турыстаў...***

— На жаль, выпадкі нярэдкія. Для ратавання альпіністаў у гарах траціцца велізарны людскі рэсурс. Вось уявіце сабе чалавека, які зламаў нагу на вертыкальнай сцяне, тады зразумееце, што зняць яго вельмі складана. Калі паказваюць у фільмах, як прылятаюць нейкія верталёты і ратуюць чалавека... Я такога ні разу ў жыцці не бачыў. Гэта толькі ў кіно такія выратаванні. Магчыма, у добрае надвор'е і знойдзецца ў Альпах які ратавальны атрад, але здарэнне, як правіла, адбываецца ў дрэннае надвор'е.

Звычайна падымаецца група з некалькіх дзясяткаў чалавек, яны правешваюць вяроўкі ўверх і ўніз. Выратаванне можа адбывацца на працягу і некалькіх сутак. Пашанцуе, калі чалавек пры гэтым выжыве.

Тут трэба зразумець адно: вы трапляеце ў зусім новы для сябе навакольны свет, які адрозніваецца ад таго, дзе вам проста і звыкла. Вы можаце не бачыць небяспекі, якая існуе, альбо, наадварот, баяцца таго, чаго не трэба баяцца. У лагерах вас навучаць таму, што рабіць трэба, а чаго — не, што можна, а чаго — не, а калі ўсё ж рабіць, то рабіць вось так, а не інакш.

***— Ці плануеце заваяваць якую-небудзь вяршыню ў найбліжэйшай будучыні?***

— Узыходжанні заўсёды трэба рабіць у кампаніі добрых сяброў. На сёння мы, вядома, вядзём падрыхтоўчую работу. У нас у Беларусі вельмі моцная каманда альпіністаў. Гэта маладыя хлопцы ва ўзросце 30 гадоў і нават маладзейшыя. Яны здольныя рабіць самыя складаныя ўзыходжанні, якія існуюць у свеце. Але вельмі многае тут звязана з фінансамі: удасца знайсці спонсараў — значыць пра нас пачуюць, не — тады пачакаем.

***— Якія цікавыя, а галоўнае, рэалістычныя фільмы пра ўзыходжанні вы можаце параіць нашаму чытачу?***

— Добры англійскі фільм, які варта паглядзець усім, называецца «Дакранаючыся да пустэчы». Досыць рэалістычна зняты. Таксама абавязкова трэба паглядзець савецкі фільм Гаварухіна «Вертыкаль» з Высоцкім.

Для тых, хто марыць калі-небудзь узабрацца на горную вяршыню, хачу сказаць, што для кагосьці альпінізм — гэта спорт, для кагосьці — чыстая рамантыка, для некага — праца. Тут кожны вырашае для сябе сам. Агульнае адно: альпінізм небяспечны з самага пачатку.

Заваяваць вяршыню нялёгка, але гэта варта патрачаных намаганняў. Бо што можа быць больш велічным і яскравым, чым стаяць на горным піку і глядзець вакол з вышыні, дзе ляцяць хіба што самалёты?

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**


Унізе — толькі аблокі.


Дамоў.

# ДОПОЛНЕНИЯ
## В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
### ПО ОБЪЕКТУ
### «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

**опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 № 148 (29517) с дополнением от 10.08.2021 № 151 (29520)**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 05.08.2021 №148 (29517), следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, цены на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

- 3 (три) однокомнатные квартиры общей площадью по проекту от 50,80 до 130,70 кв. метра на десятом этаже. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1600 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1700 долларам США;

- 1 (одна) четырехкомнатная квартира общей площадью по проекту 93,7 кв. метра. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1400 долларам США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 1450 долларам США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

# ДОПОЛНЕНИЯ
## В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
### ПО ОБЪЕКТУ
### «Многоквартирный жилой дом с помещениями общественного назначения и подземным гаражом-стоянкой по ул. Гастелло»,

**опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 № 175 (29544)**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства машино-мест в гараже-стоянке, расположенной в жилом доме по ул. Гастелло в городе Минске на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и ограничения прибыли застройщика)

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

Место нахождения: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

работа не производится в государственные праздники и праздничные дни.

Внести в проектную декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 23.12.2020 № 250 (29364) с дополнением и изменением от 01.07.2021 № 123 (29492), от 04.08.2021 № 147 (29516), от 11.09.2021 № 175 (29544), следующие дополнения:

**Сведения о количестве объектов долевого строительства (машино-мест), предлагаемых для заключения договоров, цены на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования проектной документации:**

1 (одно) машино-место № 11 общей площадью по проекту 12,50 кв. метра, расположенное на 1-м подземном уровне гаража-стоянки. Стоимость машино-места составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 15 000 долларов США при 100 % оплате цены договора. При поэтапной оплате в установленном договором период в соответствии с графиком платежей составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 16 000 долларов США.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Оплата первоначального взноса осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в местном исполнительном и распорядительном органе (если иной срок оплаты не будет установлен сторонами в договоре создания объекта долевого строительства), оставшаяся часть, в том числе при 100 % оплате цены договора, оплачивается в размере и сроки, установленные графиком платежей, являющимся приложением к договору создания объекта долевого строительства.

Прием и регистрация заявлений на заключение договора создания объекта долевого строительства осуществляется не ранее чем через 5 календарных дней после опубликования настоящей декларации в порядке очередности обращения по адресу: Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, ООО «СИ-трейдинг». Если желающий принять участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и заблаговременно письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки (с предоставлением соответствующих документов), его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу. В таком случае застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное жилое помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «СИ-трейдинг», расположенном по адресу: Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офисн. пом. № 1, телефон/факс: +375(17) 392-20-45(46), +375 (29) 333 55 66 или на сайте sit.by, gastello.by.

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | **Административно-хозяйственное здание с пристройкой** (общ. пл. 895,2 кв. м, инвент. номер 500/С-2686, по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34)** | **2 442 269,89** бел. руб. |

**В состав лота входит иное имущество, размещенное на сайте организатора торгов: www.cpo.by.** Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Сведения о земельном участке пл. 0,3112:** предоставлен на праве временного пользования по 30.04.2025 для обслуживания здания административно-хозяйственного

**Задаток 5 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в ОАО «Белинвестбанк» (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 60 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **0,5 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 02.11.2021 г.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 29.10.2021 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| Контактные данные | **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5» (Продавец)

**Лот № 1, состав:** административное здание с инв. № 630/С-47149, 647,0 кв. м.
2. Склад материальный с инв. № 630/С-47154, 397,2 кв. м.
3. Склад для горюче-смазочных материалов с инв. № 630/С-47152, 222,7 кв. м.
4. Боксы для автомашин с пристройкой подсобных помещений с инв. № 630/С-47155, 743,1 кв. м.
5. Ремонтные мастерские с инв. № 630/С-47160, 1960,9 кв. м.
6. Пристройка к реммастерским с инв. № 630/С-47158, 1360,7 кв. м.
7. Боксы для автомашин с инв. № 630/С-47156, 1123,1 кв. м.
8. Навес под баллоны с инв. № 630/С-55558, 35,0 кв. м.
9. Ограждение с инв. № 630/С-55622.
10. Ограждение с инв. № 630/С-55620.
11. Ограждение с инв. № 630/С-55611.
12. Ограждение с инв. № 630/С-55610.
13. Площадка с инв. № 630/С-55608, 7260,0 кв. м.
14. Площадка с инв. № 630/С-55607, 465,0 кв. м.
15. Оборудование котельной, инв. № 146.

Адрес: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Замковая, 33.

**Начальная цена с НДС** – 1 818 216,00 руб.

**Задаток** – 180 000,00 руб. **Штраф** – 50 000,00 руб.

Земельный участок с кадастровым номером 642000000002000230 площадью 1,3310 га. Право постоянного пользования.

Аукцион состоится **13.10.2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **11.10.2021 г. в 11.00.**

Первое, полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.06.2021 № 116.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» 12 октября 2021 года в 11.00 ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 20 % без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Прицеп специальный самосвал MAZ 856100, 2010 г. в., инвентарный номер 1972 | 7280,00 | 728,00 |
| Лот № 2 | Прицеп специальный самосвал MAZ 8561, 2010 г.в., инвентарный номер 1974 | 7280,00 | 728,00 |
| Лот № 3 | Полуприцеп специальный самосвал MAZ 9506 010, 2005 г. в., инвентарный номер 1980 | 7360,00 | 736,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел.: 23-64-24, 28-41-00.

2. Дата, время и место проведения аукциона: **12 октября 2021 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 34.

3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» от 13.04.2017 г. При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

4. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. *Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в региональной дирекции № 600 ОАО «Сбер банк», УНП 700049607, ОКПО 03454762.*

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: 08.10.2021 г., время: 17.00.

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.

8. Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещены в газете «Звязда», на сайте ОАО «ДСТ № 3».

# НАЙЛЕПШЫМ ПАДАРУНКАМ ЗАЎСЁДЫ ЛІЧЫЛА ПАДПІСКУ

## Больш за сорак гадоў выпісвае «Звязду» былая настаўніца з вёскі Тэўлі

**На такіх адданых і, галоўнае, актыўных чытачах газета трымаецца. Клаўдзія Іванаўна ЛІТВІНЧУК з вёскі Тэўлі выпісвае «Звязду» больш за сорак гадоў. І не проста чытае, робіць выразкі, адкладвае асабліва цікавыя матэрыялы, часам тэлефануе, прапаноўвае, падказвае. За апошнія два дзесяцігоддзі аўтар гэтых радкоў пісала некалькі матэрыялаў па падказцы чытачкі.**

### КАЛІ ЖЫЦЦЁ ВІРУЕ

Разам з Клаўдзіяй Іванаўнай мы некалі змагаліся супраць закрыцця гандлёвага пункта на чыгуначнай станцыі, імкнуліся дапамагчы прыватнаму прадпрымальніку набыць памяшканне даўно закрытага магазіна, расказвалі пра вялікую настаўніцкую дынастыю. Пра такіх, як яна, кажуць: чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі, не можа прайсці міма любой несправядлівасці і абавязкова заўважае ўсё добрае, прыгожае. А яшчэ ўсім дапамагае: як людзям, так і братам нашым меншым. У яе на падворку жыве шэсць катоў, былыя бадзяжныя выглядаюць гладкімі, дагледжанымі. А стане карміць курэй — дзікія галубы прылятаюць, за імі — чарада вераб'ёў, усім падсыпае зярнят гаспадыня. «Учора каты раздзерлі вужа, што запоўз на падворак, — расказвае, — дык я плакала, так шкадавала». Яна любіць, калі вакол жыццё віруе, калі шмат рознай жыўнасці.

У яе гады мала хто трымае ўласную гаспадарку, але ж яна заўсёды была актыўнай і рухавай. Пасля заканчэння геаграфічнага факультэта Брэсцкага педагагічнага інстытута ў 1968 годзе стала працаваць настаўніцай. А потым куды толькі жыццё не закідвала! Адзін час нават была тэхнікам-геолагам у геалагічнай партыі. А ў канцы 1970-х, калі школу, дзе працавала, закрылі, давялося некалькі гадоў пабыць паштальёнам. Тады, як той казаў, і падсела на разнастайную перыёдыку. У той час выпісвала 28 розных выданняў.

### НАЙЛЕПШАЯ ГАДЗІНА

Такая ў яе пазіцыя: каб людзям рэкамендаваць, трэба ж самой ведаць. Былі сярод падпіскі навукова-папулярныя, дзіцячыя, жаночыя часопісы, самыя розныя газеты. З многімі з тых выданняў Клаўдзія Іванаўна сябравала яшчэ доўгія гады, на гарышчы і зараз ляжаць падшыўкі асобных часопісаў. Цяпер з таго вялікага яе асабістага каталога засталіся «Звязда» і раёнка, якія лічыць найлепшымі сябрамі. А вось звычка рабіць падарункі ў выглядзе падпіскі засталася назаўсёды. Меншым унукам яна да гэтага дня выпісвае выданні пазнавальнага характару, старэйшаму — яго прафесійную газету, а для дачкі і нявесткі найчасцей афармляе падпіску на часопісы па гаспадарцы.

— «Звязда» прыходзіць кожны дзень. Гадзіна з асалодай чытання на роднай мове для мяне — найлепшы час сутак, — расказвае былая настаўніца. — Чытаю амаль усё. І пачынаю з анекдотаў на апошняй старонцы. Яны ў вас такія дасціпныя, сапраўды смешныя. Люблю аўтарскія калонкі, вядома, «Народ на провадзе», з задавальненнем прачытваю матэрыялы пра гістарычныя падзеі і гістарычных асоб. З цікавасцю чытаю пра розныя населеныя пункты краіны, пра вёскі. Вось вы пісалі не так даўно пра маё роднае Павіцце, што там 1300 чалавек насельніцтва і ў школе займаюцца 130 вучняў. А калі я ў школу хадзіла, у ёй вучылася 600 дзяцей, а ў вёсцы пражывала 5 тысяч чалавек.

— Асабліва люблю аповеды журналістаў з розных вандровак, — працягвае Клаўдзія Іванаўна. — Я ў свой час паездзіла па былой вялікай краіне. Некалі наша група ў інстытуцкім сацспаборніцтве заняла першае месца сярод трох тысяч студэнтаў, і нас узнагародзілі паездкай у Ленінград, дзе мы былі сем дзён. Тады я ўлюбілася ў гэты горад. Потым ужо не раз вазіла дзяцей на экскурсію.

### АБ'ЕХАЦЬ САЮЗ АЎТОБУСАМ

— А пасля чацвёртага курса ў нас была такая практыка, якая сучасным студэнтам, мабыць, і не снілася. За месяц вандроўкі на аўтобусе будучыя географы пагледзелі ледзь не ўвесь Савецкі Саюз. Інстытут плаціў за аўтобус аўтабазе ў дзень 90 рублёў — па тым часе даволі вялікія грошы. Мы ўзялі з сабой палаткі, усе прылады для жыцця ў



палявых умовах і рушылі ў дарогу. Пачалі агляд з Масквы. Некалькі дзён правялі ў сталіцы, далей — Барадзінскае поле, і праз Разань, Курск, другія гарады ўзялі курс на Каўказ. Па дарозе не міналі славутасцяў, напрыклад, у Яснай Паляне наведалі магілу Талстога. А ў Пяцігорску глядзелі лермантаўскія мясціны, і на гару Машук узымаліся, потым былі ў Арджанікідзэ, у Грозным. Пабывалі на той практыцы і ў Тбілісі, памятаю, як падымаліся ўгару, каб трапіць на магілу Грыбаедава. Па ваенна-грузінскай дарозе праехалі, узялі курс на Ерэван. Міма замка царыцы Тамары праязджалі, а калі да Ерэвана засталося менш за сотню кіламетраў, паляцеў задні мост у аўтобуса. Нашы кіроўцы выглядалі вельмі разгубленымі. Выклікаць з Брэста другі аўтобус было нерэальна. Пазванілі ў ерэванскую аўтабазу, адтуль прыслалі аўтобус і машыну тэхнічнай дапамогі. А механік, што прыехаў, як высветлілася, служыў у Брэсце. Гэта ўжо быў амаль зямляк. Адным словам, наш аўтобус адрамантавалі, за гэта нічога нават не ўзялі. А дырэктар аўтабазы, здзівіўшыся, што ўсю паездку мы жывём у палатках, уступіў нам для начоўкі свой вялізны кабінет. Назаўтра для нас правялі грунтоўную экскурсію па Ерэване, пабачылі і возера Севан.



Клаўдзія ЛІТВІНЧУК і старшыня сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА.

За месяц той практыкі мы наведалі мноства самых розных прадпрыемстваў Савецкага Саю-за, нават цяпер памятаю, як уразіў завод па вытворчасці камбайнаў у Растове-на-Доне. Праехалі па ўзбярэжжы Чорнага мора з прыпынкамі на адпачынак і купанне. Вядома, большасць з нас упершыню бачылі мора. Для будучых настаўнікаў геаграфіі гэта была надзвычай пазнавальная паездка. Назад вярталіся праз Херсон, Харкаў, Кіеў. Пасля другога курса былі на практыцы ў Карпатах і Закарпацці. З гадамі зразумела, што вучоба была самым цікавым этапам жыцця. Да гэтай пары захоўваю пасведчанні турыста СССР і інструктара па турызме.

### ЯК ПЫТАННЕ ПАДВОЗУ ДЗЯЦЕЙ ВЫРАШЫЛА

Згадвала былая настаўніца, як з дзецьмі аб'ездзіла ўсю Беларусь, экскурсіі для школьнікаў лічыла часткай вучэбнай работы. Паводле яе пераканання, чалавек павінен ведаць сваю краіну, па магчымасці бываць і недзе далей. Які прадмет ні выкладала, старалася дзяцей заразіць цікавасцю да вандровак, імкненнем пазнаваць новае. А выкладаць за гады работы ў сельскіх школах давялося ўсе прадметы, акрамя матэматыкі і замежнай мовы.

Клаўдзія Літвінчук заўсёды была актывісткай, больш за 20 гадоў узначальвала прафкамы розных школ. А калі працавала ў Рынках, вырашыла пытанне падвозу дзяцей. Тады пра школьныя аўтобусы ніхто не чуў. Добра, калі рэйсавы быў вучням па дарозе. А ў Рынкі, дзе вучыліся 240 хлопчыкаў і дзяўчынак, аўтобус хадзіў па выхадных, яшчэ ў сераду і пятніцу. Такім чынам, у панядзелак, аўторак і чацвер многім вучням належала пераадольваць дарогу ў пяць кіламетраў у адзін бок. «Сама я хадзіла праз балота, — згадвае Клаўдзія Іванаўна, — так атрымлівалася тры кіламетры. А бацькі не рызыкавалі пускаць дзяцей па дрыгве». Так і хадзілі вучні раніцай пяць кіламетраў і пасля абеду столькі ж. Было гэта недзе ў сярэдзіне дзевяностых. Настаўніца Літвінчук як старшыня прафкама па тэлефоне звярнулася да дырэктара Кобрынскай аўтабазы. Ёй ветліва адказалі, што няма такой магчымасці. Тады яна напісала ў райгазету, прыйшоў такі ж адказ, толькі пісьмовы. Але яна здавацца не збіралася, напісала ліст тагачаснаму старшыні аблвыканкама Уладзіміру Заламаю. Пісьмо ўзялася адвезці ў Брэст маці аднаго з вучняў (у губернатара быў прыём грамадзян).

— Справа была ў пятніцу, — узгадвае Клаўдзія Іванаўна. — А ў панядзелак нам пазванілі з той жа аўтабазы, каб удакладніць маршрут, найбольш зручны для дзяцей. Аўтобус, дарэчы, у вёску ходзіць і цяпер, і ўсім жыхарам навакольных сёлаў зручна.

Так што многія аднавяскоўцы да гэтай пары раяцца з ёю, калі хочуць напісаць зварот у органы ўлады альбо пайсці на прыём. Чым можа, дапамагае, і не толькі парадай. Напрыклад, недалёка жыве 95-гадовая Галіна Ісакаўна, што некалі працавала старшынёй сельсавета. Жанчына страціла мужа, адзінага сына, сваякі жывуць далёка. Клаўдзія Іванаўна забягае да яе амаль кожны дзень. Бывае, дапаможа есці зварыць сталай жанчыне, у хаце прыбраць, а галоўнае, пагаварыць, падтрымаць.

Вечарам пазваніла, расказала, што кнігу — падарунак ад «Звязды» і дыплом наш насіла паказаць Галіне Ісакаўне: «Дамовіліся, што заўтра вазьму акуляры і пачытаю ёй: маю старэйшую сяброўку надта зрок падводзіць». А першай са звяздоўскімі ўзнагародамі павіншавала нашу чытачку старшыня Тэвельскага сельскага Савета, яе вучаніца, Іна Кузняцова.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**«Смачная восень са «Звяздой»**





Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2021 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 22 кастрычніка 2021 года будуць разыграны сем тостараў Galaxy GL 2909 і суперпрыз — мультыварка Holt HT-MC-005. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 30 кастрычніка 2021 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2021 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на "Звязду" на IV квартал або II паўгоддзе 2021 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Смачная восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 27.08.2021 года.

**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2021 да 31.12.2021.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4064 ад 20.08.2021 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
*(аддзяленне сувязі)*
на IV квартал або II паўгоддзе 2021 года

Хатні адрас і тэлефон ________ (індэкс)
*(абавязкова)*

Удачы ў розыгрышы!

# У ЧАКАННІ ХАЛАДОЎ

## Ідзём на восеньскі шопінг са стылістам



**Ад світараў і кардыганаў грубай вязкі да штучных футрачкаў і ад пухавікоў да плісіраваных спадніц: чым папоўніць гардэроб напярэдадні халоднага сезона, каб выглядаць актуальна?**



Стыліст Ірына ГРЫЦУК.

«Модная сталіца» ёсць, напэўна, у кожнай краіне. І калі ў Францыі гэта Парыж, а ў Італіі — Мілан, то ў Беларусі гэта ганаровае званне, мабыць, па праве можна аддаць Брэсту. Гораду, дзе, напэўна, найбольшая сярод беларускіх населеных пунктаў колькасць дызайнераў на адзінку плошчы і на чые вуліцы модныя тэндэнцыі прыходзяць раней за іншыя гарады нашай краіны. Зрэшты, магчыма, гэта суб'ектыўна. Але прагуляцца па мінскай Нямізе мы ўсё ж вырашылі са стылістам з Брэста Ірынай Грыцук. І тэма нашай прагулкі — позняя восень і зіма.

**Вельмі часта нашы жанчыны адмаўляюць сабе ў праве апранацца стыльна, таму што баяцца, што іх асудзяць ці не зразумеюць.**

### ЛІБЕРАЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

У новым сезоне гардэробу модніцы не абысціся без футра, прычым штучнага — на подыумах дэмакратычны штучны мех не першы сезон упэўнена «падціскае» арыстакратычны натуральны. Па першапачатковай задумцы дызайнераў, такое футра ні да чаго не абавязвае, не патрабуе «адпавядаць», спалучаецца з любым гардэробам, робіць вобраз маладзейшым і бесклапотным і дэманструе непаўторны густ сваёй гаспадыні, а не яе даходы. Зрэшты, калі сёння з жывёл скуркі ўжо не здымаюць, то з модніц за трэнд «штучны мех» без усялякага сораму дзяруць тры скуры. Як высветлілася, дэмакратычнае штучнае футрачка прыстойнай якасці абыдзецца ў досыць круглую суму, якая пачынаецца ад 300—400 рублёў. Не як натуральнае, зразумела, але таксама адчувальна.

Гэтай зімой актуальны аб'ёмны мех. Зрэшты, футра можа быць і без празмернага аб'ёму — галоўнае, каб рэч была пухнатай і ўтульнай. І цёплай, зразумела?



Пухавік — самы практычны і бюджэтны варыянт. Хоць выглядаць у ім стыльна атрымліваецца не заўсёды.

Вось з гэтым у штучных футраў ёсць праблема. Пры рэкордных мінусавых тэмпературах (якімі запомнілася, напрыклад, мінулая зіма) штучны мех натуральнаму не сапернік. Відавочна, што тэкстыльная аснова, да якой мацуюцца варсінкі, не можа забяспечыць высокай цеплаізаляцыі, а сам экамех не параўнаць са шматвяковым прадуктам эвалюцыі — цёплай поўсцю пушнога звярка.

— Праўда, тэхналогіі вытворчасці штучнага футра не стаяць на месцы, — тлумачыць Ірына. — Нярэдка ў штучны мех дадаюцца валокны, якія застаюцца ад вытворчасці натуральных футраў.



Надыходзячай зімой актуальны аб'ёмны мех.

Але нават у гэтым выпадку экамех саступае па даўгавечнасці натуральнаму — варта разумець, што такое футра захавае выгляд ну максімум на два-тры сезоны. Потым мех страціць бляск, могуць з'явіцца пацёртасці. І ўсё ж штучныя кажушкі не першы сезон ультрамодная рэч, і яны заслугоўваюць увагі — як прыемнае дапаўненне да больш практычнага пухавіка.

А што з колерам? Па-ранейшаму актуальная бэжавая і карычневая гамы, высакародныя шэрыя адценні, нюдавыя і пудравыя тоны. У трэндзе белы і крэмавы, але і практычны для нашай зімы чорны ніхто не адмяняў. Яркія кажушкі на грэбні моднай хвалі, але яны падыдуць не ўсім.

— У вільготны пахмурны дзень прыемна дастаць з гардэроба жоўтае або чырвонае футрачка і ўзняць сабе настрой. Аднак вельмі важна суадносіць самавыяўленне з рэаліямі жыцця. Сёння нам хочацца вылучыцца сваёй неардынарнасцю, мы хочам, каб нас бачылі здалёк. Але ж можа здарыцца так, што заўтра ў нас зменіцца настрой і не захочацца залішняй увагі. Таму яркае футра — гэта заўсёды толькі «вішанька на торце», прыдатак да больш спакойнага гардэроба. І яшчэ адзін нюанс. Рэчы — гэта ўсяго толькі нашы дапаўненні: спачатку жанчына як асоба, а потым рэчы — а не наадварот. Адзенне не павінна нас хаваць, але не павінна і засланяць, мяняць нашу асобу. Не павінна ісці наперадзе нас, пераважаць у вобразе. Гэта — той крытэрый, па якім варта выбіраць любыя ўльтрамодныя рэчы.

У штучным кажушку, адзначае стыліст, асабліва важна звярнуць увагу на падкладку — лепш, калі яна будзе натуральнай. У гэтым выпадку мы пазбегнем эфекту «цэлафанавага пакета», калі скура не дыхае.

Таннейшае або даражэйшае штучнае футра выбраць?



Найбольш любімы дызайнерамі колер зімой 2021-22 — зялёны.

— Звычайна нашы жанчыны купляюць адну, максімум дзве верхнія зімовыя рэчы, і не на адзін сезон. А значыць, практычней будзе выбраць больш класічную мадэль без ультрамодных дэталяў — з-за іх рэч можа хутка страціць актуальнасць. На першае месца ставім якасць, тады рэч будзе доўга служыць. Прасцей кажучы, больш эканамічна выгадна набыць адну дарагую рэч замест трох танных.

### ПУХ І ПЕР'Е

Лагічная задача, якая не ўяўляе складанасці для любой нашай суайчынніцы: калі вы набываеце адзін варыянт вопраткі на зіму, то гэта... Правільна, пухавік! Не заўсёды прыгожы і модны, затое цёплы і практычны. Жанчына ў пухавіку здольная зрушыць горы без адрыву ад вытворчасці. Пухавік — досыць бюджэтны варыянт, кошт пачынаецца ў сярэднім ад 100—150 рублёў.

— Не варта сёлета спыняць выбар на сілуэтах оверсайз, — каментуе Ірына. — У надыходзячым сезоне яны яшчэ актуальныя (так што калі ў вас менавіта такі — насіце з задавальненнем), але бум «вялікіх рэчаў» быў мінулай зімой. Зараз трэнд сціхае, бо ад 80—90-х, якімі дызайнеры натхняліся ў гэтым сезоне, мода рухаецца ў бок 1970-х. А гэта паяскі, акцэнт на талію, падкрэсліванне фігуры, прамы крой. Так што прамы сілуэт пухавіка — гэта бяспройгрышны варыянт. Па-ранейшаму ў модзе сілуэт «кокан».

Актуальныя колеры — бэж, шэры, малочны (і наогул усе светлыя адценні). А таксама хакі, але гэта досыць складаны колер, які патрабуе асаблівага крою і падыдзе не ўсім. А наогул, самы трэндавы колер гэтай зімы — насычаны зялёны і ўсе яго варыяцыі (асабліва смарагдавы). У гэтым сезоне дызайнеры інтэгруюць гэты вясновы колер у любыя зімовыя вобразы: ад пухавікоў да трыкатажных сукенак і світараў.



Грубая буйная вязка світараў і кардыганаў — адзін з яркіх трэндаў гэтай зімы.

### ГЭТА ЎСЁ ЗВЯЗАНА

Трыкатаж з прыходам халадоў становіцца актуальны заўсёды. А ў гэтым сезоне рэчы з пражы заслужана апынуліся на модным Алімпе: гэты мяккі і такі прыемны навобмацак матэрыял у новых калекцыях — адна з асноў творчасці дызайнераў. Трыкатажныя сукенкі даўжыні максі становяцца ўніформай і маладых мам, і бізнес-лэдзі, інтэгруюцца ў любыя стылі і вобразы. А на світарах і кардыганах буйной вязкі хочацца спыніцца асабліва.

— Грубая буйная вязка світараў і кардыганаў — адзін з найбольш яркіх трэндаў гэтай восені і зімы, — распавядае Ірына.

**Жанчына ў пухавіку здольная зрушыць горы без адрыву ад вытворчасці. Пухавік — досыць бюджэтны варыянт, кошт пачынаецца ў сярэднім ад 100—150 рублёў.**

Праўда, купіць такія досыць складана — іх пакуль практычна няма ў асартыменце масмаркету. Затое іх можна звязаць самастойна. Ці, калі вы не майстрыца, звязаць на заказ — абыдзецца гэта (з улікам нітак) у сярэднім рублёў у 150. Проста купіць было б танней, але, на жаль, выбару практычна няма. Спалучаць такія світары можна як з джынсамі, так і з больш класічнымі палацо, а падоўжаныя мадэлі будуць выдатна выглядаць у якасці сукенкі — у садружнасці з легінсамі або шчыльнымі калготкамі.

Ключавая дэталь моднага зімовага сезона 2021/2022 — камізэлькі. У першую чаргу трыкатажныя, з глыбокім вырызам, ад стрыманых карамельных адценняў да яркіх тонаў. Такія камізэлькі дапамогуць апярэдзіць самы, здавалася б, сумны і непатрабавальны лук (look). Выдатна будуць выглядаць і камізэлькі як вопратка (пакуль не стала зусім халодна). Нам удалося знайсці трохі «хуліганскія» мадэлі з эка-скуры, якія выдатна ўпішуцца ў гламурны спартыўны стыль: апрані і адчуй сябе сяброўкай рэпера.

— Вельмі важна ўмець пашыраць рамкі разумення стылю. Гэта неабходна любой жанчыне, — кажа Ірына. — Па маім глыбокім перакананні, часам трэба дазваляць сабе рэчы, не характэрныя вам. Мадэлі, якія падабаюцца, але якія па тых ці іншых прычынах вы насіць саромеецеся. Вінаватыя комплексы, страх «што скажуць калегі?» або «як пагляздзяць сяброўкі?». Вельмі часта нашы жанчыны адмаўляюць сабе ў праве апранацца стыльна, таму што баяцца, што іх асудзяць ці не зразумеюць. І зусім ужо не павінна быць такіх аргументаў, як «не ў маім узросце» ці «я для гэтага занадта старая».

**На першае месца ставім якасць, тады рэч будзе доўга служыць. Прасцей кажучы, больш эканамічна выгадна набыць адну дарагую рэч замест трох танных.**

Трыкатажныя спадніцы-плісэ — яшчэ адна актуальная абноўка (у сярэднім ад 100—130 рублёў). Пераважная даўжыня ў дадзеным выпадку — максі (гэтай зімой дызайнеры робяць акцэнт на міні, але трыкатаж+плісіроўка для міні — варыянт не вельмі). Праўда, трыкатажныя плісіраваныя спадніцы могуць быць каварныя — яны павялічваюць аб'ёмы, калі няправільна іх абыграць.

— Я б раіла насіць такія спадніцы са світарамі оверсайз грубай вязкі, заправіўшы адзін яго краёчак. Так мы ссоўваем візуальныя акцэнты, і фігура выглядае далікатнай і жаноцкай, — тлумачыць Ірына. — Дарэчы, такія світары гэтай зімой складуць годную пару і лёгкім летнім спадніцам-плісэ, якія таксама варта ўпісаць і ў зімовы гардэроб. А можна дадаць у вобраз з трыкатажнай плісіраванай спадніцай белую кашулю, батфорты з вузкімі халявамі або, наадварот, кароткія боцікі са свабоднай халявай.

Як часта варта мяняць гардэроб, каб выглядаць актуальна?

— Я не прытрымліваюся распаўсюджанага меркавання, што купляць рэчы трэба камплектамі. Складаць «капсулу» да кожнага новага сезона — гэта нядрэнна, але па розных прычынах такі падыход магчымы далёка не для кожнай жанчыны. Я б парэкамендавала купляць рэчы штомесяц. Кожны месяц дазваляць сабе адну новую рэч — зразумела, улічваючы, як яна спалучаецца з тым, што ўжо вісіць у вашай шафе. І тады ваш гардэроб заўсёды будзе актуальны, а праблема «няма чаго надзець» адыдзе на другі план.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

# КАНЦЛЕР ДА КАЛЯД

## Што чакае Германію?



**У Германіі пачаліся перагаворы аб фарміраванні новага ўрада. На думку назіральнікаў, прапановы аб стварэнні кіруючай кааліцыі будуць непазбежна паступаць «зялёным» і лібералам (Свабоднай дэмакратычнай партыі). Між тым лідары дзвюх палітычных сіл ужо правялі папярэднія перагаворы, пасля чаго паведамілі, што шукаюць агульныя падыходы, знаходзяць іх і маюць намер сустрэцца зноў, паведаміў Euronews. Як вядома, у мінулыя выхадныя ў Германіі адбылася гістарычная падзея, наступствы якой пакуль яшчэ цяжка спрагназаваць, але ўжо можна адчуць. Упершыню за многія гады ў краіне абраны парламент без Ангелы Меркель на чале. Хрысціянска-дэмакратычны і Хрысціянска-сацыяльны саюзы (ХДС/ХСС), якія жалезная фрау прадстаўляла 16 гадоў запар, не здолелі перабіць напор асмялелых канкурэнтаў з ліку палітычных пачаткоўцаў і, страціўшы выбаршчыкаў, саступілі першынство даўнім канкурэнтам з Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (СДПГ). Што ж чакае Германію?**

### ГІСТАРЫЧНАЕ ПАРАЖЭННЕ

Вынікі выбараў у нямецкі бундэстаг для палітычных аналітыкаў асаблівым сюрпрызам не сталі. Галасаванне толькі пацвердзіла прагнозы сацыёлагаў аб катастрафічным падзенні рэйтынгу кіруючай ХДС. У параўнанні з папярэднім выбарным цыклам 2017-га хрысціянскія дэмакраты аселі на 9 працэнтаў, набраўшы крыху больш за 24 % галасоў выбаршчыкаў. У колькасным вылічэнні страты склалі больш за пяць мільёнаў галасоў, якія адышлі да СДПГ, «зялёных» і лібералаў.

Пры гэтым ХДС прымудрыўся нават у Баварыі, ключавым «хатнім» рэгіёне, дзе кіруе саюзны ХСС, паказаць найгоршы вынік за 70 гадоў. Невыпадкова ўплывовы штотыднёвік Spiegel назваў іх паражэнне гістарычным, бо ніколі раней за ХДС і ХСС не галасавала менш чым 30 працэнтаў электарату.

А вось сацыял-дэмакраты на чале з Олафам Шольцам пасля правалу на мінулых выбарах аднавілі свае пазіцыі (25,7 працэнта супраць 20,5) і цяпер заслужана святкуюць перамогу. Аднак у гэтай перамозе ёсць і важкая лыжка дзёгцю. Насуперак надзеям і чаканням сапраўднага трыумфу сацыял-дэмакратаў на гэтых выбарах не здарылася. Пасля закрыцця ўчасткаў, калі ў штабы пачалі паступаць экзітполы, абедзве партыі ішлі фактычна ўпоравень, што прымусіла ладна панервавацца функцыянераў і тэхнолагаў «чырвоных» (па сімволіцы СДПГ). У выніку галасы пратэснага электарату аказаліся размазанымі па малых партыях. Фактычна СДПГ не ўдалося да канца выканаць галоўную задачу — сабраць пад сваё крыло ўсіх перабежчыкаў і расчараваных у ХДС.

Колькасна дэпутацкія мандаты сямі партый, якія прайшлі ў бундэстаг, будуць прадстаўлены наступным чынам. Найбольшую колькасць месцаў атрымаюць сацыял-дэмакраты — 206 (на 53 больш, чым у 2017-м). На другім месцы апынуўся блок ХДС/ХСС з вынікам 196 месцаў (на 50 менш). «Зялёныя» зоймуць 118 месцаў (на 51 больш), Свабодная дэмакратычная партыя (СвДП) — 92 месцы (на 12 больш), «Альтэрнатыва для Германіі» (АДГ) — 83 месцы (на 11 менш), «Левыя» — 39 месцаў (на 30 менш). Адно дэпутацкае крэсла дастанецца прадстаўніку дацкай нацыянальнай меншасці з зямлі Шлезвіг-Гальштэйн.

Агульная колькасць дэпутатаў бундэстага ўзрасце, але не так моцна, як асцерагаліся эксперты перад выбарамі. Калі ў бягучым скліканні парламент налічвае 709 абраннікаў, то ў новы бундэстаг іх збярэцца 735. Аналітыкі прадказвалі рост гэтай колькасці да 900 за кошт малых партый, якія маглі атрымаць дадатковыя мандаты ў акругах.

### ВЫБАРЧЫ ХАОС

Што да арганізацыі выбарчага працэсу на гэтых выбарах, то ён быў далёкі ад ідэальнага, заўважыла lenta.ru. Шмат парушэнняў зафіксавана ў Берліне. Назіральнікі назвалі тое, што адбывалася, «выбарчым хаосам». На некаторых участках не хапала бюлетэняў, з-за чаго выбаршчыкаў адпраўлялі дадому. Дзесьці бюлетэні ўтрымлівалі памылкі, у выніку людзі стаялі па некалькі гадзін у чэргах і галасавалі ўжо пасля запланаванага закрыцця ўчасткаў і абвяшчэння выніку экзітполаў.

Як водзіцца, у дзень галасавання актывізаваліся і леварадыкальныя «партызаны», настроеныя на барацьбу з правакансерватыўным АДГ. Падобна на тое, менавіта дзякуючы ім ва ўніверсітэцкім Гётынгене (Ніжняя Саксонія) у дзень выбараў у бланках для падліку галасоў выбаршчыкаў у спісе партый не аказалася «Альтэрнатывы для Германіі» і іх давялося тэрмінова перарабляць. Наўрад ці гэтыя дробязі будуць вартыя ўвагі Канстытуцыйнага суда Германіі, тым не менш асадак застанецца.

Насуперак усім «падкопам» малыя партыі паказалі на гэтых выбарах сваю сілу, сукупна «адхапіўшы» ў ХДС і СДПГ важкі пакет галасоў выбаршчыкаў. «Зялёныя» на чале з Аналенай Бербок паказалі найлепшы вынік у сваёй гісторыі, палепшыўшы паказчык 2017-га больш чым удвая. Галасы 14,8 працэнта выбаршчыкаў, якія прагаласавалі, далі ім трэцяе месца ў рэйтынгу пасля ХДС.

Праўда, разлічвалі «зялёныя» на значна лепшы вынік, бо сусветны кліматычны парадак дня, прыродныя катастрофы, уключаючы паводку ў Рэйнскім рэгіёне, — усё гэта спрыяла іх рэйтынгам. Але калі першую палову кампаніі апытанні адпавядалі гэтым чаканням, то бліжэй да фіналу чарада PR-правалаў у кіраўніцтве «зялёных» прывяла да карэкцыі выніку.

Ліберальныя дэмакраты (СвДП) пад кіраўніцтвам Крысціяна Ліднера правялі даволі бледную кампанію і толькі нязначна пераўзышлі свой вынік на мінулых выбарах, атрымаўшы 11,5 працэнта супраць 10,7 у 2017-м. Аднак гэтага ім хапіла, каб абысці правапатрыятычную «Альтэрнатыву для Германіі» (АДГ) і стаць героямі дня, выпхнуўшы «страшных правых» на пятае месца ў агульным заліку.

АДГ хоць і страціла адносна няшмат, атрымаўшы 10,3 працэнта галасоў выбаршчыкаў, але пры гэтым скацілася з пазіцыі трэцяй па колькасці фракцыі ў нямецкім парламенце на пятае месца. Зрэшты, падсаладзіць пілюлю «альтэрнатыўшчыкам» могуць вынікі ў Саксоніі і Цюрынгіі, дзе засяроджаны іх найбольш адданы электарат. Па колькасці галасоў выбаршчыкаў у гэтых дзвюх усходніх землях АДГ абышла нават ХДС. Там партыя адабрала ў апанентаў шэраг важных аднамандатных акруг і стала самай папулярнай палітычнай сілай.

Сярод тых, хто прайграў на гэтых выбарах, — «левыя», якія набіраюць усяго толькі 4,9 працэнта галасоў. За чатыры гады яны страцілі амаль палову свайго электарату і цяпер балансуюць на мяжы прахаджэння ў парламент. Зрэшты, па выбарчым заканадаўстве Германіі, партыя пераадольвае пяціпрацэнтны бар'ер, калі атрымлівае яшчэ тры аднамандатныя акругі. А яны ў «левых» якраз ёсць: два ў Берліне і адзін у Лейпцыгу. Таму, нягледзячы на правал, партыя ўсё роўна сфарміруе ўласную фракцыю ў бундэстагу.

### ФРОНТМЕН АСЦЯРОЖНЫХ ПЕРАМЕН

Вырваўшы перамогу па выніках федэральнага галасавання з мінімальнай перавагай, СДПГ не здолела забяспечыць выгадную платформу ў перагаворах з партнёрамі па фарміраванні кіруючай кааліцыі. І зараз гэты вынік падвешвае шанцы кандыдата ў канцлеры ад СДПГ Олафа Шольца, нават нягледзячы на тое, што яго персанальны рэйтынг вышэйшы, чым у Арміна Лашэта з ХДС.

Пасля падліку галасоў Шольц выдаў журналістам хатнюю нарыхтоўку, агучыўшы прапанову лібералам і «зялёным». Выбаршчыкі вельмі выразна сказалі, хто павінен сфарміраваць наступны кабінет. СДПГ, СвДП і «зялёныя» дамагліся значнага росту, адпаведна, гэтыя тры партыі і павінны ўзначаліць урад. ХДС і ХСС атрымалі сігнал ад грамадзян, што ім больш не трэба быць ва ўладзе.

Калі не здарыцца нейкіх нечаканых паваротаў, то менавіта 63-гадовы Олаф Шольц сфарміруе новы кааліцыйны ўрад і стане новым канцлерам Германіі. Разбіраючыся ў прычынах яго поспеху, нямецкія каментатары вылучаюць некалькі фактараў. Першапачаткова Шольцу, хутчэй за ўсё, нямала дапамагла тая акалічнасць, што ў гэтым кааліцыйным урадзе Меркель ён займае пасаду міністра фінансаў і падчас пандэміі кіраваў раздачай мільярдаў еўра надзвычайнай дапамогі. Пэўную ролю адыгралі перадвыбарчыя тэзісы сацыялістаў і ў прыватнасці абяцанне Шольца павысіць мінімальную пагадзінную аплату працы да 12 еўра ў гадзіну з цяперашніх 9 еўра 60 цэнтаў.

Шольц злёгку памяняў імідж: палітык, якога калісьці за сухасць і безэмацыянальнасць за вочы называлі «Шальцаматам», у гэтай перадвыбарчай кампаніі пастараўся выглядаць больш жывым, усмешлівым і эмацыянальным. Але галоўнае, пра што кажуць аналітыкі, менавіта ў Шольцы, а не ў яго галоўных канкурэнтах, частка выбаршчыкаў убачыла прымальную замену «вечнай» Ангеле Меркель.

«Шольц шмат у чым адпавядае партрэту «ідэальнага канцлера» ва ўяўленні значнай колькасці нямецкіх выбаршчыкаў, у якіх ёсць запыт на перамены, але вельмі асцярожныя, з захаваннем палітычных традыцый. Сам Шольц не называе сябе наўпрост «спадчыннікам Меркель», але і не адмаўляе спадчыны «самай левацэнтрысцкай» з кансерватыўных канцлераў ФРГ. Адным словам, Шольц — гэта фронтмен асцярожных перамен на спакойнай, «бюракратычнай» аснове», — патлумачыў «Бі-бі-сі» нямецкі палітолаг Дзмітрый Страціеўскі.

### ШАНЦ НА «ЯМАЙКУ»

Але і кандыдат у канцлеры ад ХДС Лашэт здавацца не збіраецца, бо ў яго ёсць пакуль прывідны, але тэарэтычна рэальны шанц на «ямайку» — так па колерах партый называюць магчымую кааліцыю паміж ХДС, СвДП і «зялёнымі». Ужо зразумела, што ідэалагічным забеспячэннем такога праекта стане «левая пагроза». Адразу пасля выбараў Лашэт заявіў: «Галасаванне за ХДС — гэта галасаванне супраць левага федэральнага ўрада. Вось чаму мы зробім усё, што ў нашых сілах, каб сфарміраваць федэральны ўрад пад кіраўніцтвам Саюза».

Аглядальнікі прадказваюць як мінімум пяць магчымых фарматаў будучай кааліцыі. Вырашальным фактарам у яе фарміраванні стане пазіцыя «зялёных» і СвДП, менавіта з іх лідарамі будуць весці цяжкі і доўгі гандаль і Шольц, і Лашэт. Што менавіта прапануюць ім палітычныя цяжкавагавікі — пакуль незразумела. Будучыня туманная, а на сёння дакладна вядома адно — краіну чакае жорсткая барацьба за месца канцлера, што можа працягнуцца некалькі месяцаў. Для дасягнення кампрамісу Ангела Меркель фармальна будзе захоўваць сваё месца. Яна застанецца часовым канцлерам Германіі і, як чакаецца, не зможа адправіцца на пенсію як мінімум да Каляд, калі не даўжэй. У нямецкім грамадстве, без сумневу, будуць сачыць за гэтай барацьбой з не меншым азартам, чым за матчамі Бундэслігі.

За апошнія 20 гадоў палітычны цэнтр у Германіі адчувальна зрушыўся налева. А тое, што раней было рэспектабельна-цэнтрысцкім, цяпер сышло далёка направа. Пазіцыя ХДС 1980-х гадоў сёння адлюстравана ў праграме АДГ і наадварот: тое, што раней можна было чуць з вуснаў леварадыкалаў, усё часцей прамаўляюць палітыкі-цэнтрысты. Усеагульнае «палявенне» глыбока змяніла свядомасць палітычнага класа Германіі, зразумела, што гэты трэнд з непазбежнасцю прарастае ў рэальнасці. Поспех «зялёных» з радыкальнай экагендарнай праграмай, за якую галасуе малады (да 35 гадоў) і адукаваны выбаршчык, паказвае, хто будзе прэтэндаваць на палітычнае лідарства ў найбліжэйшай будучыні.




Выбары не выявілі відавочных лідараў — ні сярод партый, ні на ўзроўні асобных палітыкаў. Гэта шмат у чым лагічны вынік доўгага кіравання Ангелы Меркель, лічыць эксперт Інстытута міжнародных даследаванняў МДІМА Аляксандр Давыдаў. У 2017 годзе, напярэдадні апошніх выбараў у бундэстаг з яе удзелам, апаненты назвалі такі падыход «палітыкай снатворнага». Канцлера абвінавацілі ў тым, што сваім доўгім праўленнем яна выклікала эрозію палітычнай дыскусіі і стварыла вакуум улады. Адмова Меркель ад пятага тэрміну ва ўладзе — шанц адвыкнуць ад «таблетак», якія яна, на думку праціўнікаў, прапісвала краіне з 2005 года. Тым не менш «снатворнае» працягвае дзейнічаць. Прынамсі пакуль.

Пры гэтым важна дакладна разумець, што пры ўсіх палітычных «рэбрэндынгах» Германія застаецца палітычна залежнай ад ЗША, паколькі спецыяльна для гэтага па выніках Другой сусветнай вайны сфарміравалася цэлая міжнародная канструкцыя. Так апісаў сітуацыю lenta.ru палітолаг і старшыня Таварыства Бісмарка ў Маскве Міхаіл Галаванаў. Эксперт лічыць, што суверэнітэт нямецкай сістэмы адносна ЗША палітычна абмежаваны: у сістэму ўбудаваныя «засцерагальнікі», якія не дазваляюць нямецкім элітам весці цалкам незалежную палітыку. «Аб гэтым не кажуць уголас, але ўсё гэта разумеюць», — адзначыў ён. Галаванаў нагадаў, што ў ФРГ і іншых еўрапейскіх краінах дагэтуль знаходзяцца амерыканскія войскі. На яго думку, да з'яўлення адзінай еўрапейскай арміі Берлін так і будзе «ісці ў фарватары Вашынгтона».

**Захар БУРАК.**

ИЗВЕЩЕНИЕ (ИНФОРМАЦИЯ) О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении **22 октября 2021 года** аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества **в рамках 318-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды имущества/ сумма задатка (руб.) | Целевое использование имущества | Наименование имущества, его характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – государственное учреждение «Национальный академический театр имени Янки Купалы»**, тел.: +375 (17) 363 93 41, +375 (17) 363 60 81 (приемная) | | | | | | |
| 1 | г. Минск, ул. Фридриха Энгельса, 7 | 340,2 | 3,0 | 1 437,35 | Под размещение объекта общественного питания | Помещение общественного питания (кафе «Уршуля» 200,2 кв. м) на 1-м этаже. Обособленное подразделение. Вход отдельный. Является историко-культурной ценностью. Помещение буфета (140,0 кв. м) на 2-м этаже театра. Часть обособленного подразделения. Вход отдельный. Является историко-культурной ценностью. В помещениях имеется оборудование. На него необходимо составить отдельный договор. **Срок аренды 1 год** (1*) |
| | *1* Помещение на 1-м этаже состоит из: буфет 118,5 кв. м, моечная 9,5 кв. м, гардероб 10,8 кв. м, доготовочная 22,1 кв. м, моечная 1,3 кв. м, кладовая 5,60 кв. м, кладовая тары 4,0 кв. м, коридор 12,4 кв. м, санузел 1,8 кв. м, туалет 1,5 кв. м, тамбур 3,8 кв. м, санузел 2,8 кв. м, туалет 1,5 кв. м, туалет 1,6 кв. м, санузел 3,0 кв. м. Помещение буфета на 2-м этаже состоит из: буфет 7,4 кв. м, буфет 90,7 кв. м, буфет 9,9 кв. м, коридор 6,6 кв. м, коридор 4,3 кв. м, кладовая 4,2 кв. м, моечная 4,6 кв. м, санузел 2,6 кв. м, гардероб 9,7 кв. м. Имеются отопление, водоснабжение, канализация, электроснабжение* | | | | | |
| **Арендодатель — Республиканское унитарное предприятие «Национальный аэропорт Минск»**, тел.: +375 (17) 279 23 75, +375 (29) 885 50 49, +375 (17) 279 16 84 | | | | | | |
| 2 | г. Минск, ул. Корженевского, 41 | 556,7 | 1,2 | 1 411,23 | Под размещение объекта общественного питания | Помещение на 1-м этаже здания общежития. Имеются разгрузочная платформа, парковка, охранная сигнализация, тревожная кнопка, санузел. **Срок аренды – 3 года с даты передачи имущества в аренду** (2*) |
| 3 | г. Минск, ул. Барамзиной, 13 | 163,2 | 0,9 | 689,52 | Под размещение объекта общественного питания | Помещение на 1-м этаже здания общежития на 410 мест с пристроенным блоком обслуживания. Имеются санузел, охранная сигнализация, тревожная кнопка. **Срок аренды – 3 года с даты передачи имущества в аренду** (2*) |
| | *2* На площадях имеются центральное отопление, электроснабжение, пожарная сигнализация, возможность оказания услуг электросвязи, водоснабжение. Возможна сдача в аренду движимого имущества (кухонное оборудование, мебель)* | | | | | |
| **Арендодатель — УП «Жилье»**, тел. +375 (177) 76 85 32 | | | | | | |
| 4 | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Чапаева, 45 | 34,73 | 3,0 | 146,73 | Под размещение офиса, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группами товаров, оказание услуг (за исключением ритуальных услуг (ритуальных магазинов) и услуг по пользованию залами игровых автоматов, компьютерных игр), склад | Неизолированное нежилое помещение на 1-м этаже общежития. Стены кирпичные, вентиляция естественная, центральное отопление, освещение – электропроводка скрытая, полы – бетонная стяжка с плиточным покрытием. Доступ в помещение с ул. Чапаева. **Срок аренды – 3 года** (3*) |
| | *3* Необходимые условия: победитель (лицо, приравненное к победителю) аукциона помимо договора аренды обязан заключить договоры на вывоз твердо-бытовых отходов, на снабжение электрической энергией, на пользование тепловой энергией в горячей воде, на отпуск воды и прием сточных вод* | | | | | |

Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 360 42 22.

Аукцион состоится **22 октября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов и консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 1 октября 2021 г. по 18 октября 2021 г. включительно** в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в аукционе, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в аукционе:**

к участию в аукционе допускаются юридические или физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на указанный текущий (расчетный) банковский счет сумму задатка по соответствующему предмету аукциона, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявления на участие в торгах с приложением всех необходимых документов, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), зарегистрированные в журнале регистрации заявлений.

Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

